

ШКОЛА БУДУЧЫНІ: БЕЗ «ФІЗІКАЎ» І «ЛІРЫКАЎ»

ЧЫРВОНКА



МАДЭЛЬ ЖЫЦЦЯ. ЯК НЕ ЎПУСЦІЦЬ МАГЧЫМАСЦІ

ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

3 ВЕРАСНЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 171 (29285)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь:**

*«У Беларусі ідзе работа над канстытуцыйнай рэформай. Ужо пра папярэднія як мінімум два варыянты дакладвалі кіраўніку дзяржавы. Створана рабочая група, ідзе падрыхтоўка канкрэтных папраўак да дзеючай Канстытуцыі. Вядома ж, будзе праходзіць грамадскае абмеркаванне папраўак з усімі катэгорыямі насельніцтва. Мы лічым, што гэта самы аптымальны варыянт, не парушаючы дзеючага заканадаўства, не парушаючы дзеючага Асноўнага закона, арганізаваць нармальны, рабочы дыялог грамадства, які прывядзе ў канчатковым выніку да стабілізацыі сітуацыі, дээскалацыі тых працэсаў, якія, на жаль, сёння адбываюцца».*

# Несці слова пра мір



Фота БелТА

**Удзельнікаў XXVII Навукова-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да святыняў» вітаў епіскап Веньямін, які абраны мітрапалітам Мінскім і Заслаўскім, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі, у сталічным Свята-Духавым кафедральным саборы пасля традыцыйнага малебну напачатку маршруту.**

СТАР. 3

## КОРАТКА

- Новы Кодэкс аб адукацыі плануюць унесці восенню на разгляд у парламент.
- **Абноўленую станцыю газазабеспячэння адкрылі ў Бялынічах.**
- Чэмпіянат свету па веласпорце на шашы 2020 года прыме Італія.
- **Новую аўтадарогу адкрылі ў Віцебску.**
- Ваенныя Беларусі і Расіі абмеркавалі падрыхтоўку да сумесных вучэнняў.
- **У Беларусі распрацаваны Нацыянальны план дзеянняў па энергаэфектыўнасці да 2030 года.**
- Палескі драмтэатр паказа «Вія» на фестывалі ў Смаленску.
- **На Мінскай ЦЭЦ-3 запусцілі два электракатлы.**

На слыху

## НІЯКАГА АЖЫЯТАЖУ Ў АБМЕННІКАХ НЯМА

### Валюта пачала таннець. Можа, у людзей грошы скончыліся?

**Нагадаем, што попыт на валюту ў нашай краіне пачаў расці з апошняй дэкады ліпеня. Да сярэдзіны жніўня тэндэнцыя стала пагрозлівай, пасля чаго насельніцтва прадказальна кінулася ў абменнікі. Валюты стала не хапаць, пасля чаго яна пачала даражэць яшчэ хутчэй.**

**Вось тады Нацбанк рэкамендаваў камбанкам забяспечыць абменнікі валютай і ўзважана падыходзіць да курсаў. Спецыялісты рэгулятара адзначалі, што праблема з дэфіцытам наяўнай валюты ў некаторых банках носіць тэхнічны характар і ён звязаны з фізічнай адсутнасцю купюр з прычыны вялікага попыту. Прайшло менш за тыдзень, што змянілася на валютным рынку?**

Аўтар гэтых радкоў спецыяльна абабег каля двух дзясяткаў сталічных абменнікаў у розных раёнах горада. І ўсюды валюта была. Акрамя таго, з соткі «зялёных» можна прадаць хоць пяцьдзясят долараў, хоць пяцёрку. Рэшту атрымліваеш без праблем, валюты ў абменніку зараз хапае. А яшчэ на мінулым тыдні мне ўдалося здаць 20 долараў з 50, не было рэшты. Тады касір сказала, што прадавалі толькі тую валюту, якую здалі напярэдадні.

СТАР. 3

Лесвіца ў неба

## Узняты з попелу

**У лёсе маленькай вёскі Дарава пад Ляхавічамі, нібы ў люстэрку, адбіваецца гісторыя ўсёй беларускай зямлі. Не раз Дарава спусташалі разбуральныя войны, але кожны раз яна ў прамым сэнсе адраджалася з попелу. І сёння, як і амаль 600 гадоў таму, у яе цэнтры на пагорку ўзвышаецца касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі. Раз за разам яго адбудоўвалі прыхаджане: некалькі разоў — з дрэва, а ў 1938 годзе — з цэглы.**

СТАР. 13



**Бюст айцу Станіславу. Вернікі вёскі Дарава і сёння памятаюць свайго духоўнага папячыцеля.**

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Пачалася падпіска на «Звязду» на IV квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

Фотафакт

# СУПРАЦЬ ЧУЖЫХ ІДЭЙ!

**Мітынг супраць умяшання ва ўнутраныя справы Беларусі прайшоў учора, 2 верасня, каля Пасольства Рэспублікі Польшча ў Мінску. Грамадзяне сабраліся, каб выказаць свой погляд на недапушчальнасць навязвання чужых ідэй, падтрымку палітычнага курсу Беларусі і выбару беларускага народа.**

Аналагічны пікет, арганізаваны прадстаўнікамі гарадскіх ветэранскіх арганізацый, прайшоў і каля будынка Генеральнага консульства Польшчы ў Гродне. Да яго далучыліся і моладзь. Людзі сабраліся там,





каб выказаць сваю нязгоду з замежным умяшаннем ва ўнутраныя справы Беларусі. «Рукі прэч ад Беларусі», «Беларусь не аддадзім», «Гродна — беларускі горад» — скандзіравалі гродзенцы на мірнай акцыі. Усе яны прыйшлі, каб выказаць сваю грамадзянскую пазіцыю.

Тэматычны мітынг прайшоў таксама 31 жніўня перад будынкам Пасольства Літоўскай Рэспублікі ў Мінску, на якім моладзь, актывісты БРСМ выступілі ў падтрымку ўласнага пункту гледжання супраць навязвання поглядаў з-за мяжы, палітыкі сваёй краіны.

**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

Блізкая ўлада

## Заўсёды на сувязі

**Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, папяратворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных патынняў, якія ўзнікаюць у людзей.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 5 верасня, з 9.00 да 12.00 правядуць:

— намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

— першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ. Тэл. 8 021 222 22 22;

— намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

— першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Іван Алейзавіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

— намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатолевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;

— кіраўнік справамі Мінскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

— намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Юрый Уладзіміравіч ТРУШЧАНКА. Тэл. 8 017 222 44 44.

Экспертнае меркаванне

# «САПРАЎДНЫ ІНТЭЛІГЕНТ ПА СУТНАСЦІ СВАЁЙ — ПАТРЫЁТ»

### ХТО МОЖА НАЗВАЦЬ СЯБЕ СУЧАСНЫМ БЕЛАРУСКІМ ІНТЭЛІГЕНТАМ І ЯКУЮ ЗАДАЧУ ЁН ПАВІНЕН ВЫКОНВАЦЬ СЁННЯ?

**Прадстаўнікі навуковай, царкоўнай і грамадскай супольнасцяў учора прынялі ўдзел у круглым стале «Беларуская інтэлігенцыя ў выпрабаваннях часу» праекта БелТА і Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў «Экспертная серада».**

**Мадэратар сустрэчы, сакратар Беларускага саюза журналістаў Вадзім ГІГІН** растлумачыў, чаму менавіта такая тэма стала прадметам чарговых дыскусій: «Не патрэбна нікому казаць, што зараз наша краіна перажывае вельмі няпростыя часы, і многія позіркі скіраваны на прадстаўнікоў інтэлігенцыі. Я не вельмі люблю такі выраз як «лідары грамадскай думкі», бо справа не ў лідарстве, а ў сумленнай пазіцыі кожнага чалавека. Калі гэтая пазіцыя шчырая, адкрытая, сумленная, то людзі гэта бачаць, і сапраўды, да гэтай пазіцыі, а самае галоўнае, да чалавека, ёсць давер».

У пачатку сустрэчы спікеры паставілі пытанне: каго можна аднесці да сучаснай інтэлігенцыі нашага грамадства? Па словах **Вячаслава ДАНІЛОВІЧА, дырэктара Інстытута гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук,** чалавек, які мае дачыненне да інтэлігенцыі, павінен усведамляць сваю ролю ў грамадстве і тое, што для многіх ён з'яўляецца арыенцірам. «Неабходна адчуваць адказнасць за сваю пазіцыю і тыя ўчынкі, якія робіце, калі адносіцеся да інтэлектуальнай эліты», — дадаў ён.

**Дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ** адзначыў, што неад'емныя рысы інтэлігента — у яго здольнасці быць памяркоўным, знаходзіць кампраміс, умець кансалідавацца ў вырашэнні светлых задач і адыходзіць, калі нейкія «цёмныя» сілы аказваюць ціск на свядомасць.

«Тое, што высвятляюцца адносіны: хто, дзе стаяў і як паводзіў сябе ў тых ці іншых абставінах, — гэта яшчэ не раскол. І дай Бог, каб у асяроддзі нацыянальнай інтэлігенцыі гэтага расколу не адбылося. А ён не адбудзецца тады, калі мы будзем разумець, што інтэлігенцыя вырашае нейкую і сацыяльную задачу, згодна з якой яна не проста фарміруе эліту, а цэментуе грамадства, выкладае задачы на заўтра, дзесяцігоддзі і стагоддзі захоўвае ў няпростых умовах тэндэнцыі развіцця. Каб не было расколу, інтэлігенцыя павінна ўсведамляць, што трэба рабіць сваю справу і гэта справа павінна насіць стваральны характар», — адзначыў Аляксандр Карлюкевіч.

**Дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук, акадэмік Аляксандр ЛАКОТКА** заявіў, што «сапраўдны інтэлігент па сутнасці сваёй у першую чаргу — патрыёт»: «Інтэлігент — гэта той, хто свядома і падсвядома (і гэтак яму наканавана лёсам) усё сваё жыццё аддае народу, перажывае за яго лёс. І мы ведаем, што гістарычных прыкладаў менавіта такой інтэлігентнасці многа. І яны з'яўляюцца рухавікамі развіцця грамадства, той асновай, якая вызначае ўзровень грамадства».

Сярод тэм, якія таксама закранулі эксперты, — што азначае тэрмін «славянскае адзінства», якую ролю адыгрываюць царкоўныя дзеячы ў сучасных падзеях і як інтэлігенцыя можа кансалідаваць грамадства сёння.

*Падрабязнасці — у наступных выпусках «Звязды».*

**Марыя ДАДАЛКА.**

Міжнародны вектар

# АДЭКВАТНЫ АДКАЗ

### Падрыхтавана прапанова аб увядзенні Беларуссю асіметрычных санкцый адносна персаналіяў з краін Балтыі

**Пра гэта расказаў міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ па выніках сустрэчы ў Маскве з яго расійскім калегам Сяргеем Лаўровым, перадае БелТА.**

«Хачу сказаць, што мы таксама правялі міжведамаснае ўзгадненне і ўчора падрыхтавалі прапановы, яны ўжо зацверджаны. Прапановы аб увядзенні асіметрычных санкцый адносна адпаведных персаналій з Літвы, Латвіі і Эстоніі. Будуць і іншыя краіны ўводзіць санкцыі супраць Беларусі — мы таксама будзем прымаць адэкватныя рашэнні і даваць адэкватны адказ», — падкрэсліў Уладзімір Макей.

У санкцыйны спіс увойдуць тыя асобы, якія заўзята спрабавалі ўмешвацца ва ўнутраныя справы беларускай дзяржавы, робячы адпаведныя палітычныя заявы, уносілі канкрэтныя прапановы аб фінансавай падтрымцы апанентаў улады.

Паводле слоў міністра, беларускі бок не мае намеру публікаваць свой санкцыйны спіс, але там дастаткова ключавых асоб з трох балтыйскіх дзяржаў. «А з улікам таго, што ў нас у рамках Саюзнай дзяржавы адзіны з Расіяй спіс неўязных асоб, то гэта, я думаю, павінна прымусіць іх у пэўнай ступені задумацца», — заявіў кіраўнік МЗС.

Уладзімір Макей адзначыў, што раней пры сустрэчах і тэлефонных размовах бакі сыходзіліся на думцы, што санкцыі — гэта абсалютна непрымальны інструмент у міждзяржаўных адносінах, які адкідае супрацоўніцтва на шмат гадоў назад. «Для мяне было дзіўна, калі літаральна на другі дзень пасля выбараў (калі было яшчэ незразумела, як будзе развівацца сітуацыя) пачалі ўжо гучаць галасы, і ў першую чаргу менавіта з боку балтыйскіх дзяржаў, аб тым, што трэба неадкладна ўводзіць санкцыі супраць Беларусі», — адзначыў Уладзімір Макей.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Выдаткі Трампа на перадвыбарную інтэрнэт-рэкламу перавысілі $64 млн



Каманда прэзідэнта ЗША Дональда Трампа выдаткавала на перадвыбарную палітычную рэкламу ў Google, відэахостынгу YouTube і на іншых сумежных платформах 64,7 мільёна долараў. Яны перасягнулі рэкордныя па маштабах укладанні на гэтыя мэты экс-мэра Нью-Ёрка мільярдэра Майкла Блумберга, які дамагаўся вылучэння сябе ў якасці кандыдата на найвышэйшую пасаду ад Дэмакратычнай партыі ў гэтым годзе. Пра гэта сведчаць дадзеныя, размешчаныя на сайце Google Transparency Report. Са свайго боку дзве арганізацыі кандыдата на пасаду прэзідэнта ЗША ад Дэмакратычнай партыі Джозэфа Байдэна — «Байдэн — у прэзідэнты» і «Фонд перамогі Байдэна» — выдаткавалі на рэкламу на гэтых платформах $32,58 мільёна. Як адзначыла ў сувязі з гэтым інфармацыйнае агенцтва Bloomberg, перадвыбарчы штаб Трампа паспяхова выкарыстаў мэтанакіраваную палітычную рэкламу ў інтэрнэце падчас выбарчай кампаніі 2016 года, а ў ходзе цяперашняй кампаніі набывае рэкламу на відэахостынгу YouTube, у тым ліку на перыяд непасрэдна перад днём галасавання 3 лістапада.

## Эканоміка Аўстраліі ўвайшла ў рэцэсію ўпершыню за 30 гадоў

У другім квартале эканоміка Аўстраліі абвалілася на сем працэнтаў да першага квартала. Аб гэтым сведчаць дадзеныя Бюро статыстыкі краіны. У папярэднім квартале зніжэнне склала 0,3 %. Такім чынам, Аўстралія ўвайшла ў рэцэсію ўпершыню за 30 гадоў, паведаміў Trading Economics. Квартальнае падзенне ВУП стала максімальным з пачатку назіранняў у 1959 годзе. Аналітыкі чакалі меншага скарачэння паказчыка — на 5,9 %, сведчаць дадзеныя Trading Economics. У гадавым вымярэнні ВУП Аўстраліі знізіўся на 6,3 %. Інвестыцыі бізнесу зменшыліся на рэкордныя з чацвёртага квартала 2000 года 4,9 % пасля зніжэння на 0,5 % трыма месяцамі раней. У той жа час дзяржвыдаткі павялічыліся на максімальныя з чацвёртага квартала 1995-га 2,9 % пасля ўздыму на 2,1 % кварталам раней.



## Турыстам дазволілі здаваць тэсты на каранавірус у аэрапортах Егіпта



З 1 верасня турысты могуць здаць ПЛР-тэсты на каранавірус па прыбыцці ў Егіпет за 30 долараў, паведаміла газета Daily News Egypt. Гэта можна зрабіць у аэрапортах Хургады, Шарм-эль-Шэйха, Марса-эль-Алама і Табы. Такім чынам, тыя падарожнікі, у якіх пры сабе не акажацца ПЛР-тэста на COVID-19, зробленага не раней чым за 72 гадзіны да паездкі, змогуць патрапіць у Егіпет пасля праходжання тэсціравання ў аэрапорце. Адпаведныя меры ўведзены на падставе дырэктывы прэм'ер-міністра Мастафа Мадбулі. Пры гэтым, як заявіў Daily News Egypt старшыня Егіпецкай асацыяцыі гатэляў (ЕНА) на Чырвоным моры Алаа Акель, у сувязі з прынятым рашэннем ёсць і істотныя праблемы. «У першую чаргу гэта лагістычныя складанасці для турыстаў, якім неабходна атрымаць вынікі на працягу 72 гадзін да прыбыцця ў Егіпет», — заявіў ён. Па стане на пачатак верасня ў Егіпце зарэгістравана амаль 100 тысяч выпадкаў каранавіруса, памерлі 5,4 тысячы чалавек.

Віншуем!

# РНПЦ АНКАЛОГІІ — 60 ГАДОЎ

**Сёння РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава святкуе сваё 60-годдзе.**



У цэнтры працуе дзве тысячы медыкаў. Штодзень да іх звяртаюцца каля тысячы пацыентаў (тут ёсць свая паліклініка). У суткі хірургі-анколагі РНПЦ выконваюць да 70 аперацый. За год у стацыянары РНПЦ праводзіцца да 12 тысяч хірургічных умяшанняў, і каля чатырох тысяч — на амбулаторным этапе. Штогод лячэнне ў цэнтры атрымліваюць каля 30 тысяч пацыентаў, сярод іх — каля 2,5 тысячы замежнікаў. Пераважна ў цэнтр на дыягностыку і лячэнне прыязджаюць грамадзяне Расіі і Украіны, нярэдкія і пацыенты з Каўказскіх рэспублік і краін Прыбалтыкі. Таксама бываюць госці з Вялікабрытаніі, ЗША, Германіі, Італіі. У мінулым годзе замежныя пацыенты заплацілі за лячэнне і абследаванне ў беларускіх анколагаў каля 3,5 мільёна долараў.

— Штогадовы прырост анкалагічнай паталогіі ў краіне — больш за 50 тысяч пацыентаў. У мужчын на першым месцы па лакалізацыі — рак прастаты, у жанчын — рак малочнай залозы. Адна з надзённых праблем — рак тоўстай кішкі, — пералічвае **Сяргей ПАЛЯКОЎ, дырэктар РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава.**

«Мы ганарымся, што захавалі тое ўпарадкаванне анкалагічнай службы, якое існуе цяпер», — дадаў ён. Пяць гадоў на базе РНПЦ працуе Рэспубліканская малекулярна-генетычная лабараторыя канцэрагенезу, дзе праводзіцца сучасная дыягностыка анкалагічных захворванняў, дзейнічае Рэспубліканскі цэнтр пазітронна-эмісійнай тамаграфіі. Нядаўна адкрыты пансіянат на 118 нумароў для пражывання блізкіх пацыентаў, плануецца адкрыць аддзяленне з палатамі павышанай камфортнасці. Усяго на тэрыторыі РНПЦ 35 карпусоў і будынкаў.

* * *

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі з 60-годдзем. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што калектыву ўстановы ўдалося захаваць і прымножыць лепшыя традыцыі, выбудаваць эфектыўную сістэму аказання спецыялізаванай медыцынскай дапамогі насельніцтву, сфарміраваць уласную навуковую школу і выратаваць дзясяткі тысяч чалавечых жыццяў.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Фота Яна ХВЕДЧЫНА.**

# НІЯКАГА АЖЫЯТАЖУ Ў АБМЕННІКАХ НЯМА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пуста было каля абменнікаў у цэнтры і на ўскраіне Мінска, праўда ў невялікіх аддзяленнях банкаў бываюць нюансы. У адным такім пункце ў Фрунзенскім раёне кліента не маглі абслужыць, бо ў аддзяленні не хапала беларускіх рублёў. Гэта сведчыць аб тым, што прасунутыя людзі чакаюць далейшага патаннення замежнай валюты. А таму актыўна скідаюць свае долары, пакуль яны дарагія.

У адным абменніку літаральна за 15 хвілін курс куплі банкам долараў знізіўся з 2,65 да 2,64 рубля. І гэта пры тым, што ў нядзелю амаль усе банкі набывалі «амерыканца» за 2,7 рубля і вышэй.

Што ж кажуць аналітыкі аб сённяшняй сітуацыі? Попыт на замежную валюту ў нашай краіне ідзе на спад, што прыводзіць не толькі да зніжэння тэмпаў росту курсу на БВФБ, якое можа наогул змяніцца доўгачасовым спадам.

Пры гэтым аб'ём таргоў замежнымі валютамі на біржы максімальнага значэння дасягнуў 26 жніўня — 392,6 млн рублёў. Пасля ён пачаў зніжацца, і ў пятніцу 28 жніўня склаў усяго 181,9 млн рублёў. З 24 жніўня Нацбанк спыніў (да 15 верасня) выдачу банкам крэдытаў авернайт. А на аўкцыёне па размяшчэнні рублёвых сродкаў на тэрмін у сем дзён, які адбыўся 26 жніўня, ён выдаў банкам усяго 0,9 млрд рублёў пры попыце 2,49 млрд рублёў. Пры гэтым сярэднеўзважаную стаўку ён падняў да 13,14 % гадавых з 8,41 % на аўкцыёне 19 жніўня. Попыт на рэсурсы з боку банкаў склаў 2 487,8 млн рублёў, а атрымалі яны толькі 900 млн рублёў.

Член праўлення Нацбанка Дзмітрый Мурын падкрэсліў, што Нацбанк ажыццяўляе валютныя інтэрвенцыі, каб не дапусціць рэзкага падзення курсу рубля, але не збіраецца штучна падтрымліваць курс на якіх-небудзь мэтавых узроўнях.

**Аб сітуацыі на валютным рынку краіны выказаўся 27 жніўня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА.** На нарадзе з урадам ён заявіў, што ўлады не дапусцяць абвалу нацыянальнай валюты, але і не стрымліваюць курс рубля. Ён удакладніў, што курс беларускага рубля плавае — калі попыт вялікі, то долар ці еўра будуць каштаваць даражэй, а калі меншы, то танней. Так яно і адбываецца...

«Фундаментальных фактараў для дэвальвацыі рубля цяпер сапраўды няма, таму можна чакаць, што попыт на замежную валюту і аб'ём таргоў валютамі на БВФБ будуць скарачацца, і Нацыянальны банк паменшыць тэмпы росту курсу долара, еўра і расійскага рубля. Акрамя таго, можна прагназаваць рост прапановы валюты з боку фізічных і юрыдычных асоб, якія будуць спяшацца рэалізаваць яе, скарыстаўшыся высокім курсам. Цалкам верагодна, што пік курсаў будзе дасягнуты ўжо ў найбліжэйшыя дні, пасля чаго яны пачнуць зніжацца», — адзначаюць незалежныя эксперты фінансавага рынку краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Абмяркуем

## ПАШЫРЫЦЬ МОДУ НА ЧЫТАННЕ

**Папулярызацыя чытання сярод моладзі — тая тэма, якая ўжо не адзін год застаецца актуальнай для ўсіх, ад аўтараў і выдаўцоў да настаўнікаў і бацькоў кожнага новага пакалення. У чарговы раз сваё бачанне сітуацыі і шляхоў яе змянення агучылі ў коле бібліятэкараў і пісьменнікаў.**

— Вельмі знакава, што напачатку новага навучальнага года і напярэдадні Дня беларускага пісьменства мы гаворым пра кнігу, пра чытанне на роднай мове, — падкрэсліла **першы намеснік Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена СТЭЛЬМАХ.** — У мяне сёння ёсць магчымасць гаварыць пра кнігу ў тым ліку і з пазіцыі ўласнай творчасці, бо шэраг маіх праектаў убачылі свет у Выдавецкім доме «Звязда». Сёння пісьменнікі вельмі часта ідуць на сустрэчы з дзецьмі і ў бібліятэкі, і ў школы. І гэта вельмі важна не толькі таму, што пісьменнік сам нясе дзецям святло сваіх кніг, але і таму, што так мы больш разумеем дзіцячую псіхалогію, тэмы, якія патрэбныя гэтай аўдыторыі. І нам хочацца, каб кніга ўсё ж такі заставалася адной з галоўных крыніц ведаў і пазнання свету, бо толькі так магчыма выхаваць асобу.

Для беларускіх пісьменнікаў вельмі важна перш за ўсё пісаць на роднай мове, каб нашы дзеці чулі роднае слова, чыталі казкі і іншыя творы па-беларуску. Прысутныя адзначылі: радуе, што сёння ўзрастае імкненне з боку маладых бацькоў самім ведаць родную мову ды вучыць гэтаму сваіх дзяцей. У наш час прасоўванне кніг і папулярызацыя чытання — нялёгкая справа, паколькі дзеці і падлеткі аддаюць найбольш увагі гаджэтам. Тым жа бібліятэкам даводзіцца прыдумваць самыя розныя формы і спосабы ўзаемадзеяння з юнымі чытачамі і іх бацькамі, каб пазнаёміць іх з кніжнымі навінкамі, заахвоціць чытаць і адкрываць для сябе новых аўтараў у беларускай літаратуры.

Як заўважыла **намеснік дырэктара Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк г. Мінска Алена ЧАРНЯЎСКАЯ,** «сёння бібліятэкі не могуць жыць без пісьменнікаў, бо толькі дзякуючы добрым пісьменнікам мы маем добрыя кнігі».

— Хоць ёсць меркаванне, быццам сучасныя дзеці не чытаюць, але насамрэч яны чытаюць. У іх свае героі, свае тэмы і ўласны выбар кніг, якім яны аддаюць перавагу. І для бібліятэк зараз галоўная задача — прасоўванне чытання як працэсу, пашырэнне моды на яго, — падкрэсліла Алена Чарняўская.

**Алена ДРАПКО.**

# Несці слова пра мір

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Сёлета экспедыцыя заклікана быць не толькі асветніцкай, не толькі духоўнай, яна заклікана яшчэ да таго, каб несці слова пра мір, — сказаў мітрапаліт Веньямін. — І на гэта, прашу вас, дарагія ўдзельнікі экспедыцыі, звярнуць асаблівую ўвагу: слова пра мір, якое будзе абапірацца на Слова Божае, на слова духоўнае. Евангелле вучыць нас, як прыносіць пакаянне ў сваіх грахах, як выпраўляць гэтыя грахі, як рабіць нашае жыццё больш дасканалым. Яно вучыць нас любіць адно аднаго, любіць блізкіх і далёкіх, любіць нашу Айчыну, але любіць і іншыя краіны і народы, любіць і ворагаў сваіх».

Мітрапаліт заклікаў у дапамогу малітвы і благаславенне беларускіх святых прападобнай Ефрасінні, ігуменні Полацкай, свяціцеля Кірылы Тураўскага, святой Сафіі Слуцкай і свяціцеля Георгія (Каніскага), архіепіскапа Магілёўскага. Ён звярнуў увагу, што значная частка маршруту экспедыцыі праляжае праз Магілёўшчыну.

«Сёлета, можна сказаць, нам указаная асаблівая Божая міласць і блаславенне. Калі ў дні Святой Пасхі здзяйсняўся хрэсны ход у месца сённяшняй сталіцы Дня беларускага пісьменства, горад Бялынічы, — хрэсны ход суправаджаў бусел, птушка, якая з'яўляецца сімвалам Беларусі. Яна ішла за абразом Божай Маці, якая называецца Бялыніцкая, і паказвала нам, людзям, як пераадольваць праз малітву і зварот да Маці Божай каранавірусную бяду, як мы зможам перадолець і ўсе іншыя цяжкасці сённяшняга часу», — дадаў уладыка.

У малебне перад стартам «Дарогі да святыняў» узяў удзел **міністр інфармацыі Беларусі Ігар ЛУЦКІ.** Ён пагадзіўся, што экспедыцыя, якая традыцыйна папярэднічае Дню беларускага пісьменства і з'яўляецца яго складнікам, сёлета — не проста асветніцкая.

«На цяперашні момант мне здаецца, што гэта важная місія, якая павінна быць пранесеная па нашай краіне, каб мір і згода запанавалі ў нашым народзе, — сказаў ён. — Спадзяюся, што ў гэтыя няпростыя дні мы ўсё ж такі ўсе разам зможам наладзіць дыялог паміж грамадствам, пачуць адно аднаго, не дапусціць нейкага рознагалосся, каб і ў краіне, і ў душы ў кожнага быў мір, была згода, было адчуванне таго, што мы адзіная краіна, што заўтра дзеці пойдуць у школу, што старыя будуць заўсёды ў пашане, што ўсе мы разам будзем за гэтую нашу краіну».

**Кіраўнік экспедыцыі, навуковы супрацоўнік Нацыянальнай акадэміі навук Аляксандр ЛАПАТА-ЗАГОРСКІ** расказаў журналістам, што падчас маршруту раздадуць кнігі, якія з'яўляюцца падзякай пуцяводнай для экспедыцыі Загор'е-Сталавіцкай іконе Пакрову Прасвятой Багародзіцы. Абраз быў знойдзены ва ўрочышчы Святое Поле (ранейшая назва Папоўшчына) каля вёскі Загор'е Баранавіцкага раёна ў 1983 годзе падчас дарожных работ. Святое Поле — першы прыпынак сёлетняй экспедыцыі «Дарога да святыняў».

Па словах Аляксандра Лапаты-Загорскага, цудатворны абраз доўгі час быў дамавым мітрапаліта Філарэта, потым перайшоў у сталічны храм у гонар Свяшчэннапакутніка Уладзіміра Хіраскі, які апякае вернікаў са слабым зрокам і невідушчых.

«Ікона вернікам прыйшлася да душы, бо яна ціснёная металічналітая, і невідушчыя пальцамі яе чытаюць — «бачаць», і яна ў іх вельмі шануецца, — растлумачыў кіраўнік экспедыцыі асаблівае стаўленне такіх людзей да абраза.

Акрамя кніг, удзельнікі экспедыцыі будуць раздаваць цацкі дзецям у прытулках і ў дамах сямейнага тыпу. Таксама ў рамках «Дарогі да святыняў» запланаваныя чатыры канферэнцыі і наведванне больш як дзясятка навучальных устаноў.





**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# РЭХА МАЙДАНА

## Чым павучальны ўкраінскі вопыт?



**Апошнім часама даволі часта ў звязцы з падзеямі ў Беларусі згадваюць Украіну. Прычым параўнанні гучаць як з усходу, так і з захаду. Паралелі відомыя — падзеі лістапада 2013-га — лютага 2014-га, якія захіснулі нашу краіну-суседку. Цяжка абысціся без эмоцый, аднак паспрабуем, як кажуць, «з лічбамі на руках» разабрацца са зменненнямі ўкраінскай «матрыцы» на працягу 29 гадоў пасля абвяшчэння незалежнасці ў 1991-м. Чым павучальны гэты вопыт?**

### УНІКАЛЬНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ

Украіна атрымала ў спадчыну ад Савецкага Саюза не толькі пустыя прылаўкі, але і прамысловыя галіны, якія ўвасабляюць сёння пярэдні край тэхналагічнага прагрэсу, — уласную мікраэлектроніку, вытворчасць камп'ютараў, спадарожнікаў, авіякасмічную. Гаворка, па сутнасці, ішла аб індустрыяльнай базе, без якой цяпер немагчыма сабе ўявіць ні інтэрнэт, ні лічбавыя тэхналогіі, ні «чацвёртую прамысловую рэвалюцыю», заўважае zn.ua. Прычым у шэрагу выпадкаў краіна не проста валодала наладжанай вытворчасцю, але і ўваходзіла ў кагорту прызнаных сусветных лідараў. Пры нармальным паступальным развіцці такіх задзелаў яна магла б сёння знаходзіцца ў першым эшалоне тэхналагічнай эліты свету.

Напярэдадні абвяшчэння сваёй незалежнасці ва Украіны была моцная эканоміка, якая ўваходзіла, па класіфікацыі Сусветнага банка, у найвышэйшую падгрупу краін з сярэднімі даходамі. Так, калі ў 1990 годзе сярэднедушавыя даходы ў ёй складалі 1297 долараў, то ва Украіне — 1570. Прычым яшчэ ў 1989-м яна знаходзілася ў трыццатцы найбуйнейшых эканомік свету, як, напрыклад, Ірландыя сёння. У 1990 годзе аб'ём валавога ўнутранага прадукту Украіны (81,5 мільярда долараў у бягучых цэнах) пераўзыходзіў сумарны ВУП Чэхіі ($40,5 млрд) і Румыніі ($39 млрд), а таксама аб'ёмы вытворчасці Польшчы ($66 млрд), Ізраіля ($59 млрд) або, напрыклад, Малайзіі ($44 млрд), не кажучы ўжо пра Чылі ($33,1 млрд), адзначае zn.ua.

Па ўспамінах Любаміра Раманківа, на пачатку 1990-х найлепшыя ўкраінскія лабараторыі ў галіне мікраэлектронікі не саступалі амерыканскім. Гэта сведчанне тым больш значнае, што належыць не проста спецыялісту, які адпрацаваў больш за паўстагоддзя на IBM, а навукоўцу, чыё імя ў 2012 годзе было ўнесена ў Залу нацыянальнай славы ЗША разам з імем Стыва Джобса як аднаго з самых выдатных вынаходнікаў усіх часоў, разам з Томасам Алвай Эдысонам.

Нават пасля Чарнобыльскай трагедыі заходнія эканамісты ўсе як адзін адзначалі рэдкі сплаў адукацыйнага, навуковага і прамысловага патэнцыялаў Украіны, унікальныя чарназёмы і аграрныя магчымасці, чарнаморскія і азоўскія парты, развіты транспартны комплекс, удалае месцазнаходжанне.

Да пачатку 1990-х на стапелях суднабудаўнічага завода ў Мікалаеве знаходзіўся цяжкі авіяносны крэйсер «Вараг», які быў перапрададзены ў 1998 годзе кампаніі з Макаа, а пазней даведзены да гатоўнасці і прыняты ў склад ВМФ Кітая ў якасці яго першага авіяносца «Ляанін» (2012). Пры распрацоўцы яго палубнай авіяцыі і палігона для падрыхтоўкі лётчыкаў выкарыстоўваліся рэсурсы той жа Украіны, якія дасталіся ёй пасля атрымання незалежнасці. Першы кітайскі ледакол быў таксама пабудаваны ва Украіне — на Херсонскім суднабудаўнічым заводзе ў 1993 годзе. Не абышлося без сур'ёзнай дапамогі Украіны і развіццё ў 1990-я гады кітайскага ракетабудавання.

Па інфармацыі СМІ, ужо ў 2016 годзе Паднябесная набыла інтэлектуальную ўласнасць на транспартны самалёт Ан-225 «Мрія», а сёння кітайскія кампаніі не пакідаюць надзей завяршыць здзелку па куплі кантрольнага пакета акцый украінскага маторабудаўнічага прадпрыемства «Матор Січ». Магутнае супрацьдзеянне гэтаму з боку ЗША — сведчанне таго, што гаворка ідзе не проста аб найважнейшых прамысловых тэхналогіях, а аб ноу-хау з далёка ідучым геапалітычным падтэкстам. Дзіўныя рэчы, тым больш што ўсё гэта — выдатны падмурак савецкіх часоў.

### БЕЗ СТРАТЭГІІ

Як жа так атрымалася, што праз 29 гадоў Украіна стала аграрнай краінай, якая выжывае за кошт экспарту збожжавых, задаецца пытаннем zn.ua. Маленькай адкрытай эканомікай, цалкам залежнай ад сусветных цэн на сыравінныя тавары, якую абагналі амаль усе суседзі. Прычын вялікае мноства. «Мы ўмудрыліся зрабіць усе магчымыя памылкі за гэтыя гады, пачаўшы з асноўнай — адсутнасці стратэгічнага бачання таго, якую краіну хацелі б пабудаваць», — з горыччу заўважае zn.ua.

«Уся эканамічная палітыка 1990-х была тушэннем пажараў газай. Гіперінфляцыю, што перавышала 2000 працэнтаў у 1992-м, спынялі дзяржаўным рэгуляваннем цэн, фактычна пазбавіўшы прамыслоўцаў прыбытку. У выніку вытворчасць сталі ў перыяд з 1990-га да 1995-га ўпала на 55 працэнтаў, а металургі, якія зараблялі ў свой час у разы больш, чым простыя савецкі чалавек, сядзелі без заробатны. Для галіны, якая выпрабляла 50 мільёнаў тон сталі ў год, на ўнутраным рынку Украіны, якая спажывае каля 10 млн, стала вельмі цесна. Адзіным шанцам выжыць быў экспарт. Але замест таго, каб дапамагчы прамыслоўцам, якія прывыклі да планавай і не заўсёды лагічнай саюзнай эканомікі, адаптавацца да ўмоў крызісу, уляды вырашылі экспарт абмяжоўваць і кватаваць. Напэўна яны атрымлівалі карупцыйную рэнту ад кожнай дазволенай экспартнай здзелкі, напэўна тыя, каму дазволілі нешта прадаваць, ды яшчэ і без пошлін, шчодра плацілі за гэтыя магчымасці. Менавіта тады цэлая плеяда «моцных дзяржаўнікаў» усвядоміла, што можна нядрэнна зарабіць, нават калі вакол блукаюць тысячы беспрацоўных жабракоў. І пакуль частка чырвоных дырэктараў ламала галаву над тым, як працаваць, калі перасталі паступаць загады з цэнтра, іншая частка пачала круціцца, дамаўляцца і рваць на кавалкі савецкую прамысловую спадчыну», — піша zn.ua. Былі пахаваны многія стратэгічныя прамысловыя сектары.

Вынікам прыватызацыі стала канцэнтрацыя цэлых галін у руках адных уласнікаў. Менавіта так усё аблэнерга краіны пачалі кантраляваць шэсць чалавек, «Метінвест» Ахметава — выплаўляць 40 % усёй сталі ў краіне, а «Інтэрпайп» Пінчука — выпускаць палову ўсіх украінскіх труб, уся вытворчасць ферасплаваў аказалася ў групы «Прыват» Каламойскага і Багалюбава, а Фірташ пабудаваў сваю «азотную імперыю», адзначае zn.ua.

.Доля навукаёмістых галін ва ўкраінскай прамысловасці, якая ў 1990-м складала 30 %, знізілася да 10 %, затое ўдвая вырасла чорная металургія, а доля сыравінных тавараў дасягнула шакіруючых 70 %. У 2016-м вытворчасць экскаватараў склала 1 % ад узроўню 1990-га, прычым будаўніцтва ідзе досыць актыўна. А трактароў у 2016-м выпушчана 5 % ад колькасці, выраблёнай у 1990-м, хоць сельгастэхніка цяпер у аграрнай Украіне надзвычай запатрабаваная.

### ВЫНІК ІЛЮЗІЙ

Еўрапейская камісія штогод дае параўнальную ацэнку развіццю даследаванняў і інавацый у Еўропе — індэкс EIS. Украінскі паказчык там нязменны з 2012 года — 35-36 балаў. Для параўнання, у суседняй Польшчы індэкс інавацый у 2012-м быў 51 бал, у 2019-м — ужо 63, а лідарства цяпер у Швейцарыі, дзе індэкс вырас са 146 балаў у 2012-м да 177 — у 2019-м. У выніку і доля прамысловасці ва ўкраінскім ВУП, і доля тавараў з дабаўленай вартасцю планамерна зніжаліся ўсе апошнія 29 гадоў, саступаючы месца сельскай гаспадарцы.

«Мы даўно ператварыліся ў краіну рытэйлераў і дыстрыб'ютараў, краіну «перакупаў», якім абы танней купіць і даражэй прадаць. Мы ператварыліся з вядучага вытворцы і канкурэнта ў рынак збыту», — піша zn.ua. У выніку сальда гандлёвага балансу апошні раз было станоўчым у 2005 годзе, з тых часоў імпарт тавараў ва Украіну стабільна перавышае экспарт, і нярэдка розніца даходзіць да 8 % ад ВУП.

Украінскія рэфарматары лічылі, што «рынак усё сам адрэгулюе». Вынік падобных ілюзій перасягнуў усе магчымыя чаканні, адзначае zn.ua. Са 166 дзяржаў, па якіх Сусветны банк прыводзіць даныя рэальнага ВУП за 1990—2018 гады, падзенне паказалі толькі дзве (!) краіны — Украіна (мінус 36,1 %) і Грузія (мінус 0,8 %). Увесь астатні свет за гэтыя гады вырас: глабальны ВУП — у 2,2 раза, ВУП краін з высокімі даходамі — у 1,8 раза, краін з сярэднімі даходамі — у 3,4—3,7 раза, найбяднейшых — у 2,9 раза.

У лідарах — азіяцкія краіны. У Кітая рэальны ВУП за 1990—2018 гады вырас у 13 разоў, у В'етнама і Лаоса — у 6,4 раза!

### НА НІЖНЯЙ ПРЫСТУПЦЫ

«За тры дзясяткі гадоў мы ўмудрыліся разбазарыць амаль усё, на чым сёння грунтуецца індустрыя 4.0, пачынаючы ад мікраэлектронікі і камп'ютараў. Пасля 2015 года краіна не зрабіла ніводнага серыйнага самалёта, хоць калісьці лік штогод ішоў на сотні. Будучыня ўкраінскага ракетабудавання не больш аптымістычная. Вытворчасць легкавых аўтамабіляў упала з 402 тысяч у 2008 годзе да 5,8 тысячы летась. Прычым усе яны цяпер выпускаюцца «метадам буйнавузлавой зборкі» на адзіным прадпрыемстве», — піша zn.ua.

Страта вядучых індустрыяльных галін падарвала аснову развіцця звязаных з імі прадпрыемстваў станкабудавання, інструментальнай вытворчасці, метралогіі, матэрыялазнаўства, прамысловай хіміі. Як вынік, у 1992—2018 гадах доля апрацоўчай прамысловасці ў структуры ВУП Украіны звалілася з 44,6 да 11,5 %, апынуўшыся амаль удвая меншай за ўзровень краін з сярэднімі даходамі (19,6 %). Пры гэтым яна амаль зраўнялася з удзельнай вагой сельскай гаспадаркі (10,1 %), чыя экспартная выручка цяпер вызначае дынаміку валютнага курсу грыўні, інфляцыі і агульнай плацежаздольнасці краіны.

«Так, атрымаўшы ўнікальныя стартавы капітал, мы размянялі яго на эканамічную структуру 100-гадовай даўніны: збожжа, чорныя металы, руду — менавіта яны складалі аснову тавarнага экспарту царскай Расіі ў 1913 годзе. Мы самі загналі сябе ў сыравінную пастку, дзе з кожным годам становіцца ўсё менш прыстойных вакансій і больш «лішніх» рабочых рук. Мы пазбягаем казаць аб тым, што пасля амаль 30 гадоў «рэформаў» апусціліся ў падгрупу эканомік, за якой, па класіфікацыі Сусветнага банка, ідуць ужо толькі найбяднейшыя краіны. Ці дзіўна, што ад такіх здзяйсненняў з Украіны масава з'язджаюць людзі, і мы самі толкам не ведаем, колькі нас на самай справе засталося?», — з горычу заўважае zn.ua

### ДАЎНО І НЯПРАЎДА?

Пра падзенне ўзроўню прамысловасці Украіны яскрава выказаўся прэзідэнт краіны Уладзімір Зяленскі. Адпаведную заяву ён зрабіў падчас свайго выступлення на пазачарговым пасяджэнні Вярхоўнай рады. «Індустрыяльная слава Украіны паступова становіцца ўспамінамі. Мы рызыкуем, што пра наш прамысловы патэнцыял хутка будуць казаць, што «гэта было даўно і няпраўда», — працытавала Зяленскага «112 Украіна». Зразумела, пандэмія каранавіруса, якая захіснула нашу краіну-суседку, агульную надзвычай складаную сітуацыю значна ўскладняе.

І яшчэ. З адным з найбольш адметных артыкулаў выступіў у сваім профілі ў сацыяльнай сетцы Мікалай Азараў — украінскі палітычны і дзяржаўны дзеяч, колішні прэм'ер-міністр Украіны (прычым і ў той час, калі разгараўся так званы еўрамайдан), адзін з заснавальнікаў, член і старшыня «Партыі рэгіёнаў», народны дэпутат Украіны чатырох скліканняў, доктар геолага-мінералагічных навук, прафесар і заслужаны эканаміст Украіны. «Не магу заставацца абыякавым да таго, што адбываецца ў Беларусі... Вас штурхаюць на ўкраінскі сцэнарый, — перакананы Мікалай Азараў. — Я не хацеў бы, каб Беларусь паўтарыла падобнае... Украіна цяпер перажывае самую цяжкую трагедыю за ўсе амаль 30 гадоў сваёй незалежнасці... Хацеў бы параіць беларусам, перш за ўсё, шанаваць тое, што ёсць». Каментарыі, напэўна, залішнія.

**Пётр ДУНЬКО.**

---

Акцэнты

### Беларусь не дазволіла рэалізаваць у сябе ўкраінскі сцэнарый

Аб гэтым заявіў міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей, сустракаючыся ў Маскве са сваім расійскім калегам Сяргеем Лаўровым, перадае БелТА.

Уладзімір Макей канстатаваў, што цяпер Беларусі даводзіцца адказваць як на ўнутраныя, так і на знешнія выклікі. «Прычым апошнія ў большай ступені абумоўліваюць першыя, — адзначыў Уладзімір Макей. — Тым не менш хачу сказаць, што мы вытрымалі першы націск і не дазволілі рэалізаваць у Беларусі ўкраінскі сцэнарый, сцэнарый каляровай рэвалюцыі».

Кіраўнік МЗС Беларусі падкрэсліў, што пэўнае палітычнае процістаянне ў краіне назіраецца, але ўзровень яго напалу значна зніжаны. «І ў гэтай частцы я хацеў бы выказаць удзячнасць расійскаму боку за вытрыманую і дакладную рэакцыю на падзеі, якія разгортваліся і разгортваюцца ў Беларусі, — сказаў Уладзімір Макей. — Відаць, што менавіта ўзважаная і вельмі дакладная пазіцыя Расіі выступае той процівагай, якая стрымлівае знешнія сілы ад актыўнага ўмяшання ва ўнутраныя справы Рэспублікі Беларусь. Гэта ў сваю чаргу дае нам магчымасць перавесці сітуацыю ў больш спакойнае рэчышча, наладзіць дыялог з грамадствам ды намеціць выхады з існуючай сітуацыі».

---

Тым часам

### Ва Украіне адзначаны новы антырэкорд па колькасці захварэлых на COVID-19

**Ва Украіне па стане на раніцу серады за суткі выяўлена 2495 новых хворых на каранавірус, што стала максімальным паказчыкам з пачатку пандэміі, сведчаць даныя на сайце Сістэмы маніторынгу распаўсюджвання эпідэміі COVID-19 Савета нацыянальнай бяспекі і абароны. Агульная колькасць інфіцыраваных з пачатку пандэміі склала 125,7 тысячы чалавек. Найбольшая колькасць выяўленых выпадкаў за суткі зафіксавана ў Кіеве (332), Харкаўскай (302), Львоўскай (204), Адэскай (204) і Цярнопальскай (201) абласцях. Акрамя таго, у цэлым па Украіне было зафіксавана 2678 падазрэнняў на захворванне COVID-19.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

3 ВЕРАСНЯ 2020 г.
ЧАЦВЕР
№ 16 (15893)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Імёны

«NИTN»:

# «Маглі б іграць нават на Месяцы»




**Наша сустрэча адбылася ў незвычайным дворыку адной андэграўнднай сталічнай кавярні. Месца было выбрана музыкантамі невыпадкова, яно ў нейкім сэнсе характарызуе іх — свабодных, харызматычных, маладых і амбіцыйных. Знаёмцеся — бас-гітарыст, вакаліст і лідар калектыву Ягор ТРАЦЦЯКОЎ-САВІЧ, вакалістка Аксана КУЖАЛЕВА і гітарыст Марык КОР.**

**Нават не скажаш, што перад табой сапраўдныя рок-музыканты, настолькі сціплымі здаліся мае суразмоўнікі. Але, аказваецца, за сціпласцю рабят хаваюцца неўтаймаваная энергія, ураган і сапраўдны талент. І гэта пачынаеш адчуваць, як толькі гаворка заходзіць пра творчасць...**

***— Раскажыце пра свой гурт. Чаму такая назва?***

**Ягор:** — Пра тое ёсць трэк, праўда, мы даўно яго не выконвалі. Усе звязаны паміж сабой нябачнымі ніцямі. Нехта хоча падпарадкоўвацца ім, хтосьці не. Гэта датычыцца і нас як гурта, і людзей увогуле. Нішто не выпадкова, ніхто не выпадковы.

А пачалося ўсё яшчэ ў школе. Прыйшла ідэя, а чаму б не паспрабаваць пісаць самім песні, прыдумваць, самастойна пачаць штосьці рабіць. З сябрамі пайшлі на летнія работы, падзараблі грошай, набылі свае першыя гітары. Я — бас, мой сябар — электра (і так далей па нарастаючай), потым пазнаёміліся з Лёнем (барабаншчыкам Леанідам Вішнеўскім. — **Аўт.**), знайшлі вакалістку. Пачаліся змены ў складзе. Былі і доўгія перапынкі, пошукі сябе, розныя перыяды ў жыцці. Першы раз мы сабраліся дзесьці ў 2006-м. Праўда, не гэтым складам. Цяперашні — з канца кастрычніка—лістапада 2019-га.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Класныя навіны

## ШКОЛА БУДУЧЫНІ: БЕЗ «ФІЗІКАЎ» І «ЛІРЫКАЎ»

### Чаму для прадстаўнікоў пакалення Alfa важна забяспечыць альтэрнатыву?

**«Першая рэч, якую трэба памятаць: у свеце цяпер канфуз, змяшанне ад мноства, занадта вялікага мноства опцый. Як жа мне выбраць правільна, калі вакол так шмат усяго, але ўсё кожны дзень змяняецца? Свет прапануе нам шмат магчымасцяў, але гэта свет, у якім усё стала вельмі няўстойлівым, нестабільным. Мы цікавімся ў самых розных людзей у розных краінах свету: чаго вы хочаце? Людзі не ведаюць! Таму што доўгі час мы жылі, адштурхоўваючыся ад таго, чаго чакаюць ад нас бацькі, сваякі, грамадства. І жыццё ардынарнага, звычайнага чалавека было прадвызначанае — месцам яго нараджэння, сям'ёй, акружэннем. А цяпер няма ніякіх іерархій, няма межаў, няма нічога немагчымага, але адваротны бок такога багацця перспектыў — поўная разгубленасць: я такі малады, я не ведаю, чаго хачу, хто я... Пра гарантыі сёння наогул трэба забыцца, іх няма, трэба быць гатовымі пастаянна змяняцца і перавучвацца», — такой думкі прытрымліваюцца прафесары Нацыянальнага ўніверсітэта Сінгапура Крыстал Лім-Лэнге і Грэг Лім-Лэнге — прызнаныя міжнародныя эксперты ў вобласці адукацыі, аўтары бестселера Deep Human.**



**Якой жа павінна быць сучасная школа, каб адпавядаць патрэбам часу? Якія навыкі актуальныя для навучэнцаў? Чым павінен напаўняцца адукацыйны кантэнт? Чаму вельмі важная магчымасць выбару? Пра ўсё гэта ішла гаворка падчас 3-й канферэнцыі па альтэрнатыўнай адукацыі.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Знайсці сябе

## МАДЭЛЬ ЖЫЦЦЯ,

### або Як не ўпусціць уласнае мора магчымасцей

**Бывае так, што чалавек усё жыццё працуе ў адным кірунку, ідзе да сваёй мэты прама і ўпэўнена. Але аднойчы здараецца нечаканы выпадак, які пралівае святло на схаваныя ўнутры асобы здольнасці да іншай сферы дзейнасці. Менавіта ў гэты момант перад вачыма з'яўляецца вялікае мора магчымасцяў. Але ці кожны асмеліцца на рызыку? Танцорка, трэнер і бізнесвумен Крысціна БАРАКСАНАВА ніколі не баялася спрабаваць нешта новае і менавіта дзякуючы гэтаму стала мадэллю. Зусім выпадкова, але знайшла справу для душы.**



Бальнымі танцамі дзяўчына пачала займацца ва ўзросце чатырох гадоў. Яны сталі галоўным захапленнем сярод вялікай колькасці іншых. Разам са студыяй Крысціна аб'ездзіла з канцэртамі Еўропу. Так прайшлі доўгія і насычаныя дзесяць гадоў.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

# ШКОЛА БУДУЧЫНІ: БЕЗ «ФІЗІКАЎ» І «ЛІРЫКАЎ»

## Дзеці — іншыя!

— Калі азірнуцца вакол, то мы жывём у вельмі цікавы час, які не мае аналагаў у гісторыі. Наша эпоха вызначаецца наступнымі паняццямі: гэта нявызначанасць, нестабільнасць (ніякія доўгатэрміновыя прагнозы складаць немагчыма), празмернасць інфармацыйных патокаў, лічбавізацыя, аўтаматызацыя, глабалізацыя, урбанізацыя і старэнне насельніцтва, — разважае **сузаснавальнік і дырэктар сярэдняй школы LuCh, консультант Асацыяцыі «Адукацыя для будучыні», метадыст праекта «Настаўнік для Беларусі», спецыяліст па архітэктуры і пабудове адукацыйных сістэм Яўген ЛУФЕРЧЫК.** — І дзеці, якія сёння навучаюцца ў школе, — яны вельмі розныя. Калі я ў 2008 годзе ўпершыню ўвайшоў у аўдыторыю як настаўнік (а працаваў тады ў пятых-шостых класах), то першыя месяцы выходзіў са школы з пастаяннымі пытаннямі: «Хто гэтыя дзеці? Чаму яны настолькі адрозніваюцца ад мяне? Што імі рухае? Якая ў іх матывацыя?» І гэты быў першы мой прафесійны інсайд — дзеці цяпер іншыя! На той момант яшчэ не была сфармуляваная тэорыя пакаленняў, я гэта зразумеў, хутчэй, інтуітыўна.

**«Навучальныя праграмы і іх змест павінны адаптавацца пад інтарэсы, запыты, здольнасці і магчымасці кожнага дзіцяці».**

У сённяшняй школе цяпер навучаюцца два пакаленні, якія істотна адрозніваюцца паміж сабой. **Пакаленне Z — гэта вучні 5—11 класаў,** якія жылі ў дастаткова стабільных эканамічных умовах. Яны вельмі памяркоўна ставяцца да вялікіх інфармацыйных плыняў, у іх дастаткова добра развіта крытычнае мысленне. І яны задаюць вельмі шмат пытанняў на адрас той інфармацыі, якая транслюецца ў іх бок. Яны нікому не вераць на слова...

**Пакаленне Alfa — гэта дзеці, народжаныя прыблізна пасля 2010 года (з першых па пятыя класы).** Яны прызвычаіліся да выбару, для іх альтэрнатыва — гэта аснова ўспрымання свету.

Калі народзяцца апошнія прадстаўнікі гэтага пакалення (прыкладна ў 2025-м), іх будзе ўжо амаль два мільярды. Што нам чакаць ад іх? Можна выказваць толькі агульныя здагадкі, аднак ужо цяпер зразумела, што ўплыў тэхналогій на іх жыццё будзе каласальны. Яны будуць расці, узаемадзейнічаючы са штучным інтэлектам, робатамі і «разумнымі» цацкамі. Вялікае значэнне ў іх фарміраванні будуць адыгрываць сацыяльныя сеткі. Калі для пакалення Z сацыяльныя сеткі — гэта інструмент, для Alfa — лад жыцця. І сучасныя алгарытмы для кожнага іх прадстаўніка фарміруюць сваю інфармацыйную стужку. Аналізуючы лайкі і дызлайкі, алгарытмы падладжваюць пад іх віртуальнае асяроддзе. І «альфа»-дзецям незразумела, як можа быць па-іншаму. Чаму яны павінны вучыцца, як усе? Чаму ва ўсіх — аднолькавы набор прадметаў, аднолькавая мадэль навучання? Пакаленне Alfa з'яўляецца самым матэрыяльна забяспечаным, тэхналагічна падкаваным і адукаваным на сённяшні дзень.

Ім спатрэбяцца інтэрактыўныя персаналізаваныя праграмы і метады навучання. Мяркуючы па сусветных трэндах, вялікі працэнт дзяцей пяройдзе на анлайн-навучанне. У іх яшчэ раней, чым у «зумераў», будуць фарміравацца выразныя пасылы, да чаго трэба імкнуцца: гэта навука і тэхналогіі.



Пакаленне Alfa зоймецца работай, якая яшчэ не існуе.

## Канструктар з ведаў

— Беларуская сістэма адукацыі павінна была б адаптавацца і прапанаваць не толькі розныя адукацыйныя мадэлі ўнутры школы, але і розныя мадэлі ўнутры аднаго пакалення, — лічыць Яўген Луферчык. — Сёння мала хто спраўляецца з рэфармаваннем школы. Нават фіны спрабуюць адаптаваць сваю раней паспяховую адукацыйную мадэль, якую яны развівалі цягам апошніх пятнаццаці гадоў, пад змены, што адбыліся ў пакаленнях.

Ні для каго не сакрэт, што школы і універсітэты рыхтуюць спецыялістаў, веды і навыкі якіх ужо не актуальныя. У Расіі праводзілі даследаванне, яно паказала, што з маладых людзей, якія скончылі ВНУ ў 2018—2019 гадах, не больш як 31 працэнт уладкоўваюцца па той спецыяльнасці, якую яны атрымлівалі.

Траекторыя фармальнай адукацыі (школа — універсітэт — работа — поспех) ужо не працуе. Ёсць меркаванне, што ва універсітэтах будзе ў перспектыве запатрабаваны менавіта гуманітарны складнік, а ўсё, што лічылася прафесійнымі курсамі, моладзь будзе атрымліваць не праз універсітэт. Сувязі навучання з фізічным знаходжаннем у адукацыйнай установе практычна не будзе. Прафесійныя веды будуць атрымлівацца на практыцы, з пагружэннем у рэальны кантэкст тэмы, якая вывучаецца: гэта можа быць вырашэннем праблем лакальнай супольнасці, стварэнне стартапа ў новым горадзе і гэтак далей.

Апошнім часам расце даступнасць і папулярнасць адукацыйных анлайн-рэсурсаў і курсаў, дзе рыхтуюць больш кампетэнтных спецыялістаў, чым у ВНУ. Таксама адукацыя становіцца «канструктарам» з ведаў, якія чалавек можа перасабраць самастойна. У найбліжэйшай будучыні людзі пачнуць адукоўваць сябе самі, рэальна ўсведамляючы, якія менавіта веды ім патрэбныя. Адукацыя стане бесперапынным працэсам.

— Магчыма, у нейкай недалёкай будучыні мы будзем успрымаць універсітэт выключна як ступень для асобаснага развіцця і фарміравання канцэптуальнага погляду на свет, а не як месца для атрымання прафесіі, асабліва з улікам таго, што за жыццё нам давядзецца змяніць пяць—восем прафесій, — кажа Яўген Луферчык. — Гэта ставіць вельмі шмат пытанняў перад школай: напрыклад, якія навыкі яна павінна фарміраваць? На мой погляд, школы павінны транслява́ць дзецям думку, што тыя могуць быць паспяховымі не толькі ў рамках нейкай адной прафесіі. А мы з вамі прызвычаіліся падзяляць усіх на «фізікаў» і «лірыкаў». Хоць сучасныя даследаванні паказваюць, што гэта выключна сацыяльны феномен і няма ніякай схільнасці мозгу да той ці іншай галіны ведаў. А вось ад асобы настаўніка, ад таго, які ўстанавіўся кантакт паміж педагогам і вучнем, напрамую залежыць, ці зацікавіць вучня прадмет, які той выкладае.

Другі складнік гэтага выбару — сямейнае акружэнне. Дзеці ніколі не выбіраюць тое, што яны не бачаць вакол сябе. І калі ў сям'і культывуецца думка, што ты ў нас — матэматык, у галаве дзіцяці фарміруецца перакананне, што матэматыка — гэта маё, а ўсе астатняе — не маё. Падзел на «фізікаў» і «лірыкаў» з'яўляецца лжэнавуковым. Наадварот, трэба ўнушаць дзіцяці думку, што яно можа быць кім заўгодна: філосафам, паэтам, матэматыкам, канструктарам і гэтак далей.

**«Ва ўмовах празмернасці інфармацыі трэба сфармуляваць тое, без чаго выпускніку нельга абысціся. Выпускнік беларускай школы вывучае 18 прадметаў. Гэта вельмі і вельмі многа!»**

## Курс — на індывідуалізацыю

І ўсё ж такі, што трэба зрабіць, каб навучаць дзеля будучыні? Перш за ўсё, адмовіцца ад абавязковага запамінання інфармацыі і фактаў — машыны спраўляюцца з гэтым лепш, і мы ўжо не складзём ім канкурэнцыю. Затое вельмі важныя стратэгіі адаптацыі, уменне ўбачыць магчымасць, вынаходлівасць, прадпрымальнасць, здольнасць кантраляваць свае эмоцыі, эмпатыя. Іх нельга выкладаць як стандартныя прадметы, а хутчэй трэба ствараць асяроддзе, якое будзе падштурхоўваць чалавека да развіцця «мяккіх» навыкаў (soft skills) і больш складаных кампетэнцый.

Асобасна арыентаваны падыход павінен не толькі дэкларавацца, а рэалізоўвацца на практыцы. Навучальныя праграмы і іх змест павінны адаптавацца пад інтарэсы, запыты, здольнасці і магчымасці кожнага дзіцяці. Ва ўсіх — розная хуткасць навучання і розныя здольнасці, але гэта не павінна становіцца перашкодай для адукацыйнага працэсу. Сітуацыі, калі ўвесь клас арыентуецца на самага слабага вучня, павінны змяніцца індывідуальнымі праграмамі навучання.

У беларускай школе пакуль што дзейнічаюць адзіны для ўсіх пералік вучэбных прадметаў, тыпавы вучэбны план, адзіныя праграмы і навучальныя дапаможнікі. І нават настаўніка, у якога хацелі б вучыцца, дзеці выбіраць не могуць.

Якой жа павінна быць індывідуалізацыя?

— У залежнасці ад інтарэсаў сям'і і дзіцяці школа прапануе розны фармат навучання. Наведваць адукацыйную ўстанову зусім неабавязкова. Навучанне можа быць завочным, дыстанцыйным ці змешаным, — тлумачыць сусветныя трэнды Яўген Луферчык. — Ва ўмовах празмернасці інфармацыі трэба сфармуляваць тое, без чаго выпускніку нельга абысціся. Выпускнік беларускай школы вывучае 18 прадметаў. Гэта вельмі і вельмі многа! Якія школьныя дысцыпліны і на якім этапе вывучаць, ад чаго можна адмовіцца і што ўзбуйніць — усё гэта пытанні для нацыянальнай дыскусіі.

Акрамя дзяржаўнага мінімуму, школьнік будзе выбіраць для сябе дадаткова пэўныя кірункі і прадметы. Яшчэ адзін узровень індывідуалізацыі — модульнасць і рознаўзроўневасць праграм, калі, напрыклад, няма адзінага курса матэматыкі для ўсіх шасцікласнікаў, ён разбіты на ўнутраныя модулі, вельмі лагічныя, якія можна вывучаць на розных узроўнях. Камусьці дастаткова і першага ўзроўню матэматыкі, а камусьці патрабуецца больш глыбокі ўзровень.

Празмернасць школьнай адукацыі павінна мець на ўвазе не аб'ём ведаў, якія проста немагчыма ўпіхнуць у галаву школьніка, а шырыню магчымасцяў, з якіх дзіця будзе выбіраць тое, што яму цікава. Школа можа прапаноўваць і 25 дысцыплін, але не для таго, каб усе запар іх вывучалі, а каб забяспечыць навучэнцам магчымасць выбару.

**«Школы і універсітэты рыхтуюць спецыялістаў, веды і навыкі якіх ужо не актуальныя».**

У новым навучальным годзе ў сістэме адукацыі адкрываецца сярэдняя прыватная школа LuCh, якая ўзяла на ўзбраенне сінтэз сусветнага вопыту і найлепшых нацыянальных традыцый у навучанні і развіцці падлеткаў. Па словах Яўгена Луферчыка, новая навучальная ўстанова мае шэраг адметнасцяў. Сярод іх магчымасць выбару індывідуальных трэкаў і траекторый навучання (модуляў курсаў, кірункаў), выбар навучальных прадметаў у рамках акадэмічнай праграмы кожнае паўгоддзе, выбар узроўню, на якім будзе вывучацца той ці іншы прадмет (яго можна змяняць цягам навучальнага года), навучанне праз практыку і эксперымент, сінтэз класічных прадметаў і сучасных міждысцыплінарных ведаў, прымяненне фарміруючага ацэньвання прагрэсу дзіцяці па некалькіх крытэрыях адукацыйнага выніку, рацыянальнае выкарыстанне digital-інструментаў. Асноўныя класічныя прадметы — гэта матэматыка (пяць гадзін на тыдзень), руская мова, інтэграваная з рускай літаратурай (чатыры гадзіны), беларуская мова, інтэграваная з беларускай літаратурай (чатыры гадзіны), і англійская мова (пяць гадзін). З новых міждысцыплінарных прадметаў — гісторыя цывілізацыі (тры гадзіны на тыдзень) і прыродазнаўства/навука (дзве гадзіны). Для выбару прапануюцца прадметы Art, Sciense, фізічная геаграфія, логіка, тэхналогіі, мейкерства, інжынірынг, біялогія, хімія, фізіка, праграмаванне, дысцыпліны па мовах. На рэфлексію і развіццё сацыяльных навыкаў soft skills таксама прадугледжаны дзве гадзіны.

— На наш погляд, вельмі актуальнай з'яўляецца ўстаноўка на развіццё навыкаў саманавучання, — падкрэслівае Яўген Луферчык. — Падтрымаць дзіця, а не забіць у ім жаданне да самаразвіцця, — вось што насамрэч для школы важна. Тым больш што быць сярэднім выпускніком, сярэднім студэнтам і сярэднім спецыялістам становіцца эканамічна нявыгадна.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Прыемнае з карысным

# У ЗАМЕЖЖА, ДА МОРА, НА ЗАРОБКІ...

**Падпрацоўка... Напэўна, гэтае слова вядома многім студэнтам. Пасля пар нехта з іх бяжыць у кавярню на месца барыста або афіцыянта, хтосьці працуе кансультантам у краме... Але ёсць і тыя, хто, як той казаў, простых шляхоў (вакансія па месцы вучобы, у родным горадзе) не шукаюць. Як, напрыклад, мае суразмоўніцы, якія вырашылі знайсці часовую работу за мяжой. Дзяўчаты падзяліліся з «Чырвонкай. Чырвонай зменай» тым, што імі рухала, чаго яны дамагліся і якія высновы ў выніку зрабілі для сябе па выніках паездкі.**



Падчас работы Яўгенія *(крайняя злева)* падцягнула італьянскую мову.

**Студэнтка трэцяга курса факультэта міжкультурных камунікацый МДЛУ Яўгенія ГРАК** нават не разглядала варыянт падпрацоўкі ў Мінску:

— Я вывучаю тры замежныя мовы, адна з якіх — італьянская. Хацелася палепшыць свой узровень валодання ёй, а найбольш эфектыўны спосаб гэта зрабіць — акунуцца ў асяроддзе носьбітаў. Мяне ўвогуле вельмі цікавіць Італія, таму было імкненне пабываць там не як турыст, а пагладзець на яе жыццё знутры. Да таго ж, гэта паездка, акрамя работы, давала магчымасць правесці два месяцы на моры, палепшыць здароўе.

Уладкоўвалася я з дапамогай расійскага агенцтва, бо ў нашых супрацоўніцтва з Італіяй не вельмі развітае. Дарэчы, я была першай беларускай, якую адпраўлялі туды на работу. Агенцтва працуе такім чынам: ты плаціш за афармленне дакументаў, дарогу туды і назад, а яно гарантуе візу, харчаванне і пражыванне. На гэтую авантуру рашылася адна, бо лічу, што менавіта ў такія падарожжы лепш ехаць без кампаніі. Тады ты разлічваеш толькі на сябе, маеш шанц сябе выпрабаваць.

Я трапіла ў невялічкі гатэль. Ён размяшчаўся каля горада Атранта, што на поўдні Італіі. Працавала афіцыянтам і барменам, але з-за таго, што штат работнікаў быў не вельмі вялікі, у мае абавязкі ўваходзіла яшчэ і абслугоўванне гасцей, прыём і дастаўка заказаў. Прымала іх і ў бары, рабіла каву. Часам мыла посуд, прыбірала ў рэстаране. Звычайна працавала ранкам і ўвечары, таму ўвесь дзень быў вольны і была магчымасць з'ездзіць у горад, паляжаць на пляжы, адпачыць.

Кіраўніцтва было такое, што лепшага нельга сабе ўявіць! Гатэль належаў дружнай і прыязнай сям'і. Я ведала кожнага з іх, падтрымлівала цёплыя стасункі, і нават зараз мы з імі на сувязі. Звальняцца было цяжка. Мой бос, яго жонка і дзеці вельмі сумавалі і плакалі разам са мною.

Наконт заробку... Атрымала прыкладна столькі ж, колькі ўклала ў паездку. Але я вярнулася дадому з бясцэнным вопытам і з вялікім багажом прыемных эмоцый... Вельмі добра падцягнула італьянскую мову. Акрамя таго, выйшла з зоны камфорту, бо да гэтай вандроўкі была сапраўдным дзіцем, якое прызвычаілася, што ўсё за яго робяць бацькі. А там я была сама за сябе. Ці паехала б яшчэ раз? Так, так і яшчэ мільён разоў так!



Самай цікавай забавай для Вольгі было скаканне са скал у мора.

**Студэнтка чацвёртага курса факультэта міжнародных эканамічных адносін БДЭУ Вольга ЛАЗАРЧЫК** папросту натрапіла на аб'яву кампаніі, якая прапаноўвала работу за мяжой. Персанал быў патрэбны па розных кірунках: шукалі барменаў, афіцыянтаў, пакаёвак, аніматараў, адміністратараў...

Вольга расказвае:

— Пачала наводзіць даведкі, фірма аказалася надзейнай. Паразмаўляўшы з бацькамі, рашылася. Разам з сяброўкай спыніліся на Балгарыі, бо хацелася быць бліжэй да мора.

Калі мы прыехалі на месца ў курортны комплекс, нас засялілі ў бунгала, якое было ў страшэнна дрэнным стане. Настолькі, што хацелася дадому вяртацца, але мы спрачаліся, настойвалі, і праз пару дзён нас перасялілі ў адмысловы будынак для персаналу.

Звычайна працавалі з ранку да чатырох гадзін вечара: рыхтавалі залу для адпачывальнікаў, сервіравалі сталы, потым суправаджалі пастаяльцаў, арыентавалі іх у памяшканнях. Нязвыклым да працы было вельмі цяжка, яны амаль плакалі ад стомы. Мне было прасцей, бо я імкнуся зарабляць для сябе нейкія грошы з 14 гадоў. Для тых, хто хацеў атрымаць больш, такая магчымасць давалася. Пасля выканання сваіх непасрэдных абавязкаў, увечары, можна было яшчэ шчыраваць, напрыклад, афіцыянтам. Я аднойчы паспрабавала дадаткова папрацаваць на кухні. Спадабалася не вельмі, таму вырашыла пакінуць больш часу на адпачынак.

Але не ўсё было гладка, часам у калектыве ўзнікалі канфлікты. Звычайна не ладзілі з пастаяннымі работнікамі рэстарана, мясцовымі жыхарамі. Але кіраўнік спраў заўсёды быў за нас і падтрымліваў у спрэчных момантах. Усе недахопы кампенсаваліся тым, што мы раззнаёміліся з хлопцамі і дзяўчатамі, якія працавалі ў іншых сэрвісах. Разам шукалі цікавыя мясціны навокал. Напрыклад, знайшлі вельмі прыгожыя скалы і скакалі з іх у мора. Гэта было самай цікавай забавай.

Наконт таго, ці хацела б я паехаць туды зноў... Не так даўно злавіла сябе на думцы аб тым, што, напэўна, так. Можа, нават на той самы курорт. Бо, зноў жа — шмат знаёмых, з якімі хацелася б сустрэцца і зноў акунуцца ў тую асаблівую атмасферу.

**Паліна ПРАКАПЕНЯ,**
**студэнтка III курса**
**факультэта журналістыкі БДУ.**
**Фота з архіваў суразмоўніц.**

Як відаць, нашым гераіням пашчасціла з падпрацоўкай у замежжы, яны засталіся задаволеныя паездкамі. Тым жа, хто толькі збіраецца паўтарыць іх шлях, будзе карысней наступная інфармацыя. Пры падрыхтоўцы да вандроўкі трэба абавязкова захоўваць асноўныя правілы (абапіраючыся на інфармацыю, размешчаную на сайце https://konsalt.by/):

1. Пераканайцеся, што кампанія насамрэч існуе: звярніце ўвагу на юрыдычны адрас і рэгістрацыйны нумар. Па гэтых звестках любую фірму можна знайсці на сайце Міністэрства юстыцыі нашай краіны. Праверце, ці актуальныя тэлефоны для сувязі, якія размешчаны на сайце кампаніі.

2. Звярніце ўвагу на ліцэнзію. У СНД усе агенцтвы па працаўладкаванні грамадзян за мяжой абавязаны яе атрымаць. У Беларусі такі дазвол дае Міністэрства ўнутраных спраў. Ліцэнзія выдаецца на садзейнічанне ў працаўладкаванні па канкрэтных спецыяльнасцях у пэўных краінах. Пералік такіх фірмаў ёсць на сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

3. Выбірайце агенцтва, якое аказвае паслугі па дагаворы. Вы складаеце яго з фірмай на аказанне пасрэдніцкіх паслуг па пошуку работы за мяжой. У ім пералічаныя правы і абавязкі бакоў і прыблізныя палажэнні будучага працоўнага пагаднення. Пасрэдніцкі кантракт адрозніваецца ад працоўнага тым, што першы заключаецца з агенцтвам, а другі — з наймальнікам. Да таго, як паедзеце на работу за мяжу, фірма ў Беларусі адсылае ваш працоўны дагавор з працадаўцам у дэпартамент па грамадзянстве і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў.

## Ад рэдакцыі

Канешне, гэты матэрыял быў напісаны раней. Нашмат раней, чым мы ўсвядомілі ўсю небяспеку каранавіруса... Мы планавалі надрукаваць артыкул бліжэй да лета, каб даць моладзі карысную інфармацыю. Хто ж думаў, што граніцы будуць закрыты і адпачынак праз пандэмію стане «невыязны»?.. Мы правялі яго дома, марачы пра мора і пясчаны пляж, новых сяброў і ўражанні... Так, навала яшчэ цалкам не пераможана, але сітуацыя рана ці позна стабілізуецца, граніцы адкрыюцца і зноў з'явіцца магчымасць вандраваць па свеце. Таму — наўздагон лету — эмоцыі тых, хто ў свой час ужо паспеў ажыццявіць такую мару, і карысныя звесткі для тых, у каго ўсё яшчэ наперадзе.

Новыя старты

## БРСМ ЗАПУСКАЕ ПРАЕКТ «#МОЯПЕРВАЯ10»

**Яго мэта — стымуляванне школьнай моладзі да атрымання ведаў, прапаганда дзесяцібальнай сістэмы ацэнкі ведаў у навучэнцаў, распрацоўка і ўкараненне новых формаў работы з моладдзю.**

Удзел у праекце могуць прымаць навучэнцы 8—11 класаў сярэдніх школ, якія ў перыяд правядзення акцыі атрымалі па адным са школьных прадметаў адзнаку 10 балаў, а таксама навучэнцы 9 і 11 класаў, якія па выніках заканчэння 2020/2021 навучальнага года маюць сярэдні бал атэстата 10.

Праект будзе рэалізоўвацца ў пачатку кожнай вучэбнай чвэрці, а таксама па працягу тыдня пасля ўручэння атэстатаў у 9 і 11 класах: першая чвэрць — з 1 да 10 верасня, другая чвэрць — з 9 да 14 лістапада, трэцяя чвэрць — з 11 да 16 студзеня 2021 года, чацвёртая чвэрць — з 5 да 10 красавіка 2021 года.

Удзельніку неабходна апублікаваць сэлфі са старонкай дзённіка, дзе прастаўлена адзнака 10 (альбо з атэстатам па выніках заканчэння 2020/2021 навучальнага года) ва ўласных сацыяльных сетках з хэштэгам #мояпервая10. Па выніках правядзення кожнага з этапаў праекта ўсе ўдзельнікі атрымаюць у падарунак сувенірны промабокс ад Саюза моладзі асабіста ў рукі альбо на хатні адрас.

Як дадалі ў ЦК БРСМ, маладзёжны праект «#МояПервая10» — гэта ініцыятыва Гомельскай абласной арганізацыі, якая была падтрымана на рэспубліканскім узроўні.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Голас з замежжа

## «ШТО ЗАРАЗ АДБЫВАЕЦЦА Ў ВАС?»

**Да моладзі нашай краіны звярнуўся ансамбль «Касаўскія півоні», сабраны з 15 гарадоў і вёсак «сэрца Сербіі» — Косава і Метохіі, «вашы браты і сёстры, славяне, вашы векавыя сябры — сербы! Нядаўна некаторыя з нас скончылі ўніверсітэт, некаторыя заканчваюць вучобу. Мы вашы равеснікі».**

Звяртаючыся і аналізуючы ўласную гісторыю, маладыя сербы з болем назіраюць тое, што адбываецца зараз у Беларусі.

«У сённяшнім спажывецкім свеце ўсё больш хочацца ўвесь час мяняць і партнёраў, і вопратку, і машыны... Але Радзіма ж адна! Яна адзіная!»

Маладыя сербы ў лісце да сваіх беларускіх равеснікаў згадваюць не толькі палітычныя падзеі апошняга часу.

«Чаму вы не бачыце, што ваш Прэзідэнт як дасведчаны лідар падчас «кароны» не дазволіў поўную ізаляцыю чалавека ад чалавека, глыбока паважаючы тое, што ў менталітэце ўсіх славян закладзена — змагацца разам. Увесь свет глядзеў на вас і паважаў вас за гэта...

Хіба вы не зразумелі, што многія з нас глядзяць на Беларусь з павагай за тое, што вы знаходзілі ў сабе сілы дзесяцігоддзямі даглядаць сваю краіну, перамагаць на сусветных спаборніцтвах, адстойваць свае годнасць і суверэнітэт?»

Напрыканцы ліста сербскія равеснікі звяртаюцца да маладых беларусаў у спадзяванні, што тыя ўсё зразумеюць. «Зразумеюць, што трэба захоўваць адзінства народа, веры і дзяржавы, каб быць незалежнай, свабоднай, цудоўнай краінай.

**Абдымаем вас, нашы дарагія сябры.**
**З любоўю, верай і надзеяй**
**з «сэрца Сербіі» — Косава і Метохіі!»**

Свой выбар

# ПСІХАЛОГІЯ ДАВЕРУ

## Як маладым спецыялістам яе сакрэты спасцігаюцца на практыцы

**Дваццацідвухгадовая Яніна КАЦЯРЫНІЧ працуе педагогам-псіхолагам у сацыяльна-педагагічным цэнтры ў вёсцы Гаць Акцябрскага раёна. Скончыла Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны і па мэтавым накіраванні два гады таму прыехала на малую радзіму.**



— Прыкладна ў восьмым класе школы вырашыла, што ў будучыні стану псіхолагам. Гэтае жаданне ўзнікла з нагоды таго, што сябры часта казалі: я ўмею слухаць, даваць карысныя парады. Бацькі таксама падтрымалі мой выбар прафесіі. Ды і я была цалкам упэўненая ў сваіх сілах. Адзінае, перад паступленнем думала: больш прыйдзецца па душы кірунак, дзе трэба праводзіць заняткі са сваімі аднагодкамі ці дарослымі, але лёс вырашыў інакш і цяпер працую з дзецьмі.

Гады вучобы ва ўніверсітэце Яніна ўспрымае вельмі сур'ёзна. Кожны дзень тады для дзяўчыны быў адкрыццём: калі даведвалася нешта новае для сябе, ёй хутчэй хацелася замацаваць атрыманыя веды на практыцы.

**«Бывае, што яны не адразу падпускаюць да сябе, можа спатрэбіцца і шэсць, восем размоў, каб наладзіць кантакт».**

— Гэта быў час, калі я спазнавала сябе, даведвалася аб сваіх магчымасцях. Вучэбныя практыкі праходзіла як у сваёй навучальнай установе, так і ў іншых, напрыклад, выкладала псіхалогію студэнтам педагагічнага каледжа імя Л. С. Выгоцкага. Але самая запамінальная з усіх прайшла ў Гомельскай абласной клінічнай псіхіятрычнай бальніцы. Памятаю, гэта было самае прэстыжнае месца для студэнтаў, туды накіроўвалі па паспяховасці ў навучанні, я і трапіла.

Зразумела, некаторыя чаканні ад свайго першага рабочага месца ў маладога спецыяліста з цягам часу знікаюць, калі сутыкаешся з цяжкасцямі. І гэта нармальна, лічыць гераіня.

— У большасці вучоба ва ўніверсітэце па маёй спецыяльнасці была арыентавана на работу ў школах, таму калі прыехала на малую радзіму і размеркавалася ў сацыяльна-педагагічны цэнтр, усё было ў навінку. Спачатку адчувала пэўныя складанасці, аднак з кожным днём «набівала руку», расла прафесійна. Тым больш мне дапамагаюць дасведчаныя калегі.

Яніна займаецца з дзецьмі ад трох да васямнаццаці гадоў, з іх бацькамі, прыёмнымі сем'ямі, якіх у суразмоўніцы на сёння дванаццаць. Таксама за ёй замацаваны некаторыя вясковыя школы раёна. Часам дзяўчына наведвае і суды, абараняе правы непаўналетніх.

— Са «сваімі» дзецьмі (так педагог называе наведвальнікаў заняткаў) я праводжу розныя групавыя і індывідуальныя кансультацыі, гульні. Бывае, што яны не адразу падпускаюць да сябе, можа спатрэбіцца і шэсць, восем размоў, каб наладзіць кантакт. Аднак калі дзеці пачынаюць давяраць — гэта самае прыемнае ў рабоце. Я па жыцці даволі спакойны чалавек і лічу, што гэта, безумоўна, дапамагае ў маёй прафесіі. Таму калі вы вельмі актыўны, імпульсіўны ці няўседлівы і хочаце стаць псіхолагам, дзе-нідзе давядзецца стрымліваць гэтыя рысы свайго характару. А вось што мне часам перашкаджае падчас работы — залішняя эмпатыя да іншых.

Суразмоўніца кажа, што па-за работай яна не выкарыстоўвае свае веды дзеля асабістых мэт, — этычны кодэкс псіхолага не дазваляе. Хоць сябры і родныя часта звяртаюцца па ўсялякія парады.

— Каб самаўдасканальвацца ў прафесіі, стараюся чытаць шмат карыснай літаратуры, даведваюся пра новыя імёны ў сферы псіхалогіі, заўсёды нешта вывучаю. Зараз мне падабаецца працаваць з дзецьмі, але ў будучыні хацела б паспрабаваць сябе ў рабоце і з дарослымі. Разумею, што ў вялікіх гарадах мая прафесія вельмі запатрабаваная, але хачу развівацца ў родным Акцябрскім раёне, быць карысным тут.

...Увогуле лічу сябе творчай асобай, люблю вязаць, шыць, плесці, а таксама вырошчваць расліны. Можна правесці паралель паміж гэтым хобі і маёй работай: тыя, з кім працую, з часам расцвітаюць як кветачкі!

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота з архіва гераіні.**

# МАДЭЛЬ ЖЫЦЦЯ...



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Аднак, калі надышоў пераходны ўзрост, а школа ў родным горадзе змянілася сталічным каледжам, густы дзяўчыны нечакана перавярнуліся, як той казаў, з ног на галаву. Пад уплывам модных фільмаў накшталт «Крок наперад», «Дабіся поспеху» і іншых Крысціна прыйшла да бацькоў з навіной, што кідае бальныя танцы і пачынае займацца хіп-хопам. Маме было складана пагадзіцца з такім рашэннем. Але ўсе цяжкасці хутка зніклі, калі жанчына ўбачыла, якой матывsituаванай і натхнёнай вяртаецца дадому з трэніровак яе дачка. Танцоры вельмі пашанцавала з трэнерам, Дашай Рысенковай — сапраўднай хіп-хоп-дзяўчынай з вольнай натурай і цікавымі думкамі. Пад яе кіраўніцтвам атрымліваліся ўсе рухі, і на выступленнях Крысціна заўсёды стаяла ў першых радах і была ў сапраўдным захапленні ад стылю танца, які абрала.

На апошнім курсе каледжа юнай танцорцы захацелася знайсці работу, каб часткова самастойна забяспечваць свае патрэбы. Так Крысціна трапіла на пасаду харэографа ў школу, дзе на працягу трох наступных гадоў вучыла дзетак танцаваць хіп-хоп.

Але ў пачатку чацвёртага настаўніца зразумела, што ёй не хапае часу на сваё асабістае развіццё. Стала адчуваць, што знаходзіцца ў нейкім творчым застоі, заўважыла эмацыянальнае выгаранне. Звярнулася да кіраўніцтва з просьбай даць ёй паўзу. І дзяўчыне пайшлі насустрач.

**Таксама адзначае, што немалаважную ролю ў фарміраванні навыку як «паставіць ножку» сыгралі менавіта танцы.**

З гэтага моманту і стартавала мадэльная гісторыя Крысціны, хоць сама прыгажуня да апошняга моманту не ўсведамляла, што пачынае займацца сапраўдным мадэлінгам. Аб тым, як быў зроблены «крок наперад» у мадэльны свет, успамінае сама дзяўчына:

— Я не фатаграфавалася прафесійна прыкладна да 22 гадоў. Увесь папярэдні час была настолькі з галавой паглыблена ў танцавальны свет, што не бачыла нічога навокал і не ўяўляла сябе нікім іншым, акрамя трэнера. Да таго ж вельмі камплексавала з-за няроўных зубоў. І вось, калі паставіла брэкеты, у мяне адбылася першая прафесійная фотасесія. Гэта было амаль выпадкова, бо мы з фатографам знайшліся ў групе «УКантакце», пасля чаго дамовіліся аб сустрэчы. Памятаю, як яна тады мяне расхваліла! Запэўнівала, што маю вельмі цікавую і незвычайную знешнасць, што абавязкова трэба пачаць здымацца...

Увогуле, фатограф тады сапраўды заматывавала. Аднак я не пачала хадзіць па мадэльных школах і агенцтвах, не шукала самастойна брэнды для супрацоўніцтва. Напэўна, па волі лёсу ўсё само ішло ў мае рукі: пасля першай здымкі пачалі пісаць у Instagram і запрашаць на работу зноў і зноў.

Крысціна прызнаецца, што актуальныя ідэі для пазіравання яна падглядае там жа, у Instagram. І гэта можа быць як фота вядомай ва ўсім свеце мадэлі, так і здымак выпадковай дзяўчыны. Таксама адзначае, што немалаважную ролю ў фарміраванні навыку як «паставіць ножку» сыгралі менавіта танцы:

— У нас ёсць пластыка, незаціснутасць. Мы можам выкарыстоўваць шматлікія нетыповыя позы, запазычаныя з харэаграфіі. Акрамя таго, сёння кожнаму брэнду патрэбны відэакантэнт. Таму гэта вялікі плюс, калі мадэлі на здымках дынамічна рухаюцца, усміхаюцца, паводзяць сябе расслаблена.

**Дзяўчына падзялілася, што мае яшчэ шмат ідэй наконт уласнага развіцця ў розных сферах дзейнасці.**

Сёлета Крысціна запусціла сваю вытворчасць купальнікаў, для фарміравання каталога таксама наймала мадэляў. Таму ведае гэтую «кухню» з абодвух бакоў: выканаўцы і наймальніка. Сама дзяўчына супрацоўнічае з такімі вядомымі беларускімі брэндамі, як «Kazaki», «MurMur», «Sorochinskaya» і іншымі. Часцей за ўсё яны дамаўляюцца на ўмовах бартару.

— Звычайна мы робім здымкі за якую-небудзь рэч, напрыклад за джынсы або сукенку. Для мяне гэта вельмі зручна, бо люблю стыльна апранацца. Калі адкрывала свой брэнд купальнікаў, таксама дарыла іх мадэлям за ўдзел у фотасесіі.

На пытанне аб тым, як дзяўчына падтрымлівае сябе ў форме, адказвае шчыра:

— Мне дасталіся вельмі добрыя гены ад бацькоў — тыя на працягу ўсяго жыцця стройныя і прыгожыя. Хоць я і не абмяжоўваю сябе ў ежы, але ніколі не таўсцею. *(Усміхаецца.)*

**«Напэўна, па волі лёсу ўсё само ішло ў мае рукі: пасля першай здымкі пачалі пісаць у Instagram і запрашаць на работу зноў і зноў».**

Пакуль што Крысціна супрацоўнічае толькі з беларускімі брэндамі. Агенцтва шмат разоў запрашала мадэль на работу ў Кітай, аднак з-за пандэміі гэтыя планы давялося адкласці.

— Увогуле, мадэльная сфера для мяне — гэта класнае хобі. Зрабіць яго сваёй прафесіяй я не магу, бо рост у 169 сантыметраў падыходзіць толькі для работы ў Паднябеснай. Асабіста мяне тое не засмучае, бо я кайфую, калі здымаюся!

Дзяўчына падзялілася, што мае яшчэ шмат ідэй наконт уласнага развіцця ў розных сферах дзейнасці. І пакуль не паспрабуе ўвасобіць у рэальнасць кожную, спыняцца не будзе. Таму Крысціна зараз і не будуе планаў, бо не ведае, якое вялікае мора магчымасцяў чакае яе за паваротам, на новым этапе жыцця!

**Паліна ПРАКАПЕНЯ,**
**студэнтка III курса факультэта журналістыкі БДУ.**
**Фота дадзена суразмоўніцай.**

Камертон настрою

# Мікі Маўс кажа: «Прывітанне»,

## ці Папулярызацыя мовы па-сямейнаму

**Наталля і Павел БЫЧКОВЫ — пара з Мінска, якая займаецца агучваннем і перакладам розных фільмаў і мультфільмаў на беларускую мову. З нядаўніх часоў яны робяць гэта ў рамках праекта і ўжо нават сапраўднага бізнесу «Гаварун — мультфільмы па-беларуску». Аб тым, як з'явілася ідэя, якія этапы прайшлі маладыя людзі, каб дабіцца падтрымкі аўдыторыі, і ўвогуле, ці запатрабаваны беларускамоўны кантэнт на сёння, даведаліся ў суразмоўнікаў.**






Павел апошнія дзесяць гадоў працаваў у Беларускім навукова-даследчым інстытуце транспарту, Наталля скончыла Акадэмію мастацтваў па кірунку «Рэжысура і акцёрскае майстэрства». Чатыры гады таму сужэнцы даведаліся, што ў іх народзіцца сын. У той час і з'явілася ідэя стварыць нешта сваё.

— Яшчэ калі знаходзілася ў дэкрэце, хацела ў чымсьці самарэалізавацца, — падзялілася Наталля. — Сумавала па хоць якой-небудзь справе. Мы заўсёды вельмі добра ставіліся да роднай мовы, да таго ж у нейкі момант вырашылі выхоўваць на ёй сына. А што любяць дзеці? Мульцікі. Таму абралі менавіта гэты кірунак. На жаль, у беларускамоўных сем'ях у малых амаль няма магчымасці глядзець папулярныя мультфільмы на роднай мове — іх вельмі мала. Таму вырашылі зрабіць усё самастойна. Для нас тады гэта быў эксперымент, паралельна шукалі «асноўную» работу. Аднак дамовіліся з Пашам, што ўсё роўна адразу будзем ствараць прафесійны кантэнт.

— У пачатку свайго творчага шляху мы акцэнтавалі ўвагу на фільмах. Цікавіліся разнастайнымі жанрамі: трылерамі, драмамі, фантастыкай, — дадаў Павел. — З іх адбіралі самыя папулярныя і запатрабаваныя навінкі. Першая кінастужка, якую мы агучылі, была «Бегчы па лязе» Рыдлі Скота з Гарысанам Фордам у галоўнай ролі. Тады яшчэ не ведалі многіх нюансаў, аднак гледачы ацанілі нашу работу высока, было шмат добрых каментарыяў. Пасля пачалі шукаць карысныя вузкаспецыялізаваныя кнігі, каб удасканаліць свае навыкі, напрыклад захапіліся работай аднаго з педагогаў па сцэнічнай мове Андрэя Каляды, а менавіта яго кніжкай і аўдыядыскамі з узорамі вымаўлення. Дзякуючы ім і навучаліся беларускаму літаратурнаму вымаўленню. Памятаю, як пагрузіўся ў гэта з галавою, днямі напралёт нешта вывучаў. Стала зразумела, што нам трэба працаваць па многіх аспектах: як над вымаўленнем, акцёрскім майстэрствам, так і над паляпшэннем тэхнічных складнікаў.

Работа над агучкай у суразмоўнікаў пачыналася ў самаробнай студыі: з добрым USB-мікрафонам, прафесійным софтам і старэнькім ноўтбукам.

— У нас была маленькая камода, дзе мы паставілі сцяну з кніжак і гукаізаляцыйную шырму. Паша зрабіў драўляныя каркасы, паміж імі паклалі чатыры стойкі. На «кракадзільчыках» замацавалі коўдру і яшчэ адну паклалі наверх. Было няўручна, бо заставалася мала месца, аднак іншага выбару не было. Зараз наша гукавая кабінка нашмат лепшая, чым раней. Тут ёсць усё неабходнае для таго, каб мы не перашкаджалі суседзям, і яны нам таксама, — гукаізаляцыя як мае быць. Збіраў муж гэту студыю самастойна пры дапамозе розных відэа ў інтэрнэце, — кажа Наталля.

***— Як і калі ў вас з'явілася каманда? Чаму абралі менавіта гэтых маладых людзей?***

— Мы з Наталляй адказваем за агучку і мантаж. У пэўны момант зразумелі, што без спецыяліста-перакладчыка і рэдактара не абысціся, — расказвае Павел. — Выпадкова пазнаёміліся з перакладчыкам-аматарам Цімафеем Каліноўскім. Разам з ім працавалі над фільмамі «Дзікія гісторыі» Даміяна Сіфрона, класікай з Мэрылін Манро «Хтосьці любіць больш гарачае» рэжысёра Білі Уайлдэра, папулярным аўтарскім «Лобстэрам» Ёргаса Ланцімаса, «Інтэрстэларам» Крыстафера Нолана і іншымі. Потым пасябравалі з выдатным мовазнаўцам Львом Глушыцкім (дарэчы, колішнім стыльрэдактарм «Звязды». — **Аўт.**). Дзлегавалі яму рэдактарскую і перакладчыцкую дзейнасць. Яшчэ пазней у камандзе з'явілася перакладчыца з прыгожым аўтарскім стылем Ксенія Капіца. Цімафей па пэўных абставінах сышоў, і атрымалася каманда з чатырох чалавек. Нам падабаецца, што мы аднадумцы, апантаныя беларускай мовай, кінематографам. Іншымі словамі, можна сказаць, — каманда мары.

— Нашы перакладчыкі знаходзяць трапныя беларускія адпаведнікі словам з арыгінальнай мовы, каб фразы на роднай не расцягваліся ўтрая даўжэй. Бо англійская, напрыклад, даволі сціслая, а ў беларускай могуць быць складаныя адпаведныя канструкцыі, — дадае Наталля. — Разам з камандай робім гатовы прадукт прыкладна за тыдзень. Бывае, што агучваць фільм ці мультфільм не вельмі складана, аднак з пункту гледжання тэхнічнай часткі — наадварот. Паша цэлымі днямі сядзіць у студыі, я менш — трэба ўдзяляць час сыну. Зараз працуем над чатырма рознымі мультсерыяламі паралельна. Часта занятыя па выхадных.

***— Раскажыце пра этапы лакалізацыі фільма ці мультфільма.***

— Самы першы — знайсці належны матэрыял, які не будзе парушаць аўтарскіх правоў, іншымі словамі, можна яго легальна агучваць, — расказваюць героі. — Потым Ксенія і Леў дасылаюць нам пераклад з арыгінальнай мовы (англійскай або нямецкай), мы, у сваю чаргу, закідваем файл у патрэбную праграму і запісваем галасы. Пасля адпраўляем гэты чарнавік на рэдактарскі і аўтарскі кантроль, каб зразумець: ці, можа, трэба выкарыстаць іншае слова па сэнсе або выправіць націск. Леў і Ксенія дасылаюць нам заўвагі, мы выпраўляем памылкі. Апошні этап — дадаём гукавыя эфекты, зводзім дарожкі і загружаем гатовы прадукт на YouTube ці перадаем на платформу, дзе можна легальна яго размясціць.

Суразмоўнікі адзначылі, што настрой, з якім сядаюць за работу, вельмі ўплывае на яе эфектыўнасць і канчатковы вынік.

— Бывае, што з-за кепскага самаадчування не хочацца нічога рабіць, працэс ідзе значна марудней, аднак работа ёсць работа. З іншага боку, ёсць мультфільмы накшталт «Петсана і Фіндуса», яны быццам цябе «лечаць» ад хандры, зараджаюць пазітыўнымі эмоцыямі, — кажа Наталля.

***— Як вы рыхтуецеся перад запісам?***

— Робім невялікую размінку, прагаворваем скорагаворкі. Таксама важная трэніроўка на дыханне, так развіваем дыяфрагму. Цяпер на гэта сыходзіць хвілін 10—15. Але спачатку, калі толькі ставілі вымаўленне, маглі гадзіну прасядзець за такімі практыкаваннямі. Дарэчы, падчас агучвання мульціка «Мікі Маўс» Паўлу трэба рабіць вельмі высокі тонкі голас, ён хутка садзіцца, і патрабуецца дзень, каб яго аднавіць. Або, напрыклад, калі шмат спяваць ці крычаць (што адбываецца часта), потым хочацца дзень памаўчаць. Ёсць і такі момант: калі не запісваеш нешта некалькі дзён запар, цяжка потым уключыцца ў работу, таму стараемся не рабіць вялікіх перапынкаў, — расказваюць суразмоўнікі.

***— Ці хутка вы пачалі зарабляць на сваім праекце?***

— Нам спатрэбілася тры гады, — падзяліўся Павел. — Цяпер мы ўжо юрыдычна афармленае ІП. Вялікіх грошай не атрымліваем, аднак стабільнасць у чымсьці ўсё ж такі з'явілася. Раней збіралі іх праз краўдфандынг, зразумела, хацелася большага, але быў шэраг праблем. У краіне амаль няма ініцыятыў, падобных на нашу, бо не існуе пляцовкі, дзе можна было б змяшчаць такія работы. Адпаведна, мала лакалізаванага па-беларуску матэрыялу, асабліва актуальнага, і не пашыраецца кола зацікаўленай у беларускамоўным кантэнце аўдыторыі. Да таго ж, ёсць праблемы з манетызацыяй, — амаль немагчыма атрымаць грошы за сваю творчасць. Выходзіць замкнёнае кола. А многім зараз хочацца глядзець усё анлайн, у адзін клік. У свой час для медыясэрвіса Megogo мы агучылі шэсць фільмаў, але гэта была валанцёрская работа, за якую не атрымлівалі ніякіх ганарараў. Было супрацоўніцтва з Voka, але, на жаль, нядоўгае. Таму вырашылі не траціць час, абралі самую буйную медыясетку ў свеце — Youtube, дзе кожны можа глядзець усё, што хоча бясплатна.

***— Хто ваш галоўны крытык?***

— Наш сын, ён першы глядач. Ужо пасля чакаем рэакцыі ад іншых. Да крытычных каментарыяў ставімся спакойна, ва ўсіх розныя густ. Дарэчы, Мацей дапамагаў запісаць застаўку на наш канал і канцоўкі ў мульціках. Там, дзе трэба было шчыра смяяцца, мы яго казыталі. Ён увогуле даволі артыстычны хлопчык, добра спявае, — з цеплынёй кажа Наталля.

***— Зараз вы пераважна працуеце над мультфільмамі. Робіце акцэнт на карысныя або больш арыентуецеся на папулярныя?***

— Дзеці любяць усё яскравае, яркае. Ідэя праекта «Гаварун — мультфільмы па-беларуску», які мы запусцілі сёлета, у тым, каб штомесяц адначасова выпускаць некалькі серыялаў для рознай узроставай аўдыторыі, на розны густ, расказваць і паказваць цікавы кантэнт. Каб ён не толькі папулярызаваў беларускую мову, але навучыў базавым агульначалавечым каштоўнасцям: адказнасці, справядлівасці, дабрыні, сапраўднаму сяброўству, пазнаёміў з навакольным светам. Мы выбіраем мультфільмы і па папулярнасці, і па тым, наколькі яны будуць карысныя для дзяцей. Гэта вельмі важна. Ёсць выдатны мульцік «Рабакар Полі», там апісваецца шмат сітуацый з жыцця, напрыклад, расказваецца ў забаўляльнай форме аб правілах паводзін на дарозе, такая інфармацыя будзе цікавая і бацькам, — падзяліліся суразмоўнікі.

***— Які на сёння самы папулярны па прагляду мультфільм з вашай агучкай?***

— Як ні дзіўна, «Мікі Маўс». Таксама многім падабаецца «Хамф» — для дзетак да трох гадоў, «Петсан і Фіндус», за два месяцы ён сабраў ужо дзве тысячы праглядаў. Мы тры месяцы вялі перагаворы, каб атрымаць дазвол на работу з ім, — расказвае Павел. — Дарэчы, здавалася б, мы адкрылі краўд-кампанію ў самы няўручны час, калі пачалася эпідэмія каранавіруса. Між тым знайшлі 150 чалавек, якія нас падтрымліваюць пастаянна. Паступова колькасць аўдыторыі расце. Пакуль што галоўная праблема ў тым, што мы — лакальны праект, не агульнавядомы. Рэкламу ў свае фільмы не ўстаўляем, а на дзіцячым канале на YouTube яна ўвогуле блакіруецца. Таму пакуль асноўны варыянт — дзяліцца ўражаннямі аб нашым прадукце праз сацсеткі, — кажа Павел.

**«Мы заўсёды вельмі добра ставіліся да роднай мовы, да таго ж, у нейкі момант вырашылі выхоўваць на ёй сына».**

***— Што параіце тым, хто хоча заняцца тым жа, што і вы?***

— У такой справе важна не толькі знайсці аўдыторыю, але яшчэ і захаваць яе надоўга. Таксама трэба не збаўляць абароты і рэгулярна выпускаць новыя серыі мультсерыялаў, аптымальная колькасць — некалькі разоў на тыдзень. Тады падпісчыкі прыходзяць хутчэй. Прыемна, калі нехта ў каментарыях раіць паглядзець наш канал, некаму рэкамендуе. Разумеем, што трэба выходзіць на іншы ўзровень, напрыклад, заахвочваць рускамоўную аўдыторыю, з іншых краін, — расказвае Наталля.

— На сваім прыкладзе мы паказваем, што лакалізацыя фільмаў ці мультфільмаў не каштуе вялікіх грошай. Каб займацца іх агучваннем, па-першае, павінна быць вялікае жаданне. Можна навучыцца і авалодаць і тэхнічнай часткай, і вымаўленне сабе паставіць добрае, трэба толькі захацець. Калі ёсць талент — выдатна, але гэтага мала. Варта разумець, што нічога не атрымаецца хутка, не будзе лёгка, сыдуць месяцы і нават гады, каб дабіцца пэўнага ўзроўню. Не будзе «бац», — і ты прачнуўся з дзясяткамі тысяч падпісчыкаў. Гэта паўсядзённая руцінная работа, дзе шмат неканструктыўнай крытыкі, нядзячнасці. Да таго ж важна, якога ўзроўню вы хочаце дасягнуць. Калі халтуранка, дык гэта адно, калі лепшага, іншае, — упэўнены Павел.

***— Якія творчыя планы на найбліжэйшую будучыню?***

— Хочам пашыраць і развіваць тое, што ўжо ёсць, у перспектыве марым пра вялікую студыю, якая робіць беларускамоўны закадр і дубляж для самых розных крыніц: кінатэатраў, анлайн-сэрвісаў, тэлебачання. Дзе можна было б працаваць і праводзіць заняткі для маленькіх навучэнцаў, — кажуць суразмоўнікі.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| Продавец | **Торговое унитарное предприятие «Белкоопвнешторг Белкоопсоюза», г. Минск, промузел Колядичи, ул. Бабушкина, 62, каб. 215** |
| Оператор ЭТП | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| Адрес ЭТП | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**
Местоположение: **Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Михаила Морозова, д. 87**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Лот № 1** | | | |
| **Пожарное депо** | Здание специализированное иного назначения | 198 кв. м | 610/С-523 |
| Составные части и принадлежности: три пристройки | | | |
| **Склад строительных материалов** | Здание специализир. складов, торг. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ | 93,6 кв. м | 610/С-54361 |
| **Участок регенерированного волокна** | Здание специализир. для производства регенерир. волокна | 854,8 кв. м | 610/С-18518 |
| Составные части и принадлежности: пристройка | | | |
| **Сооружение для хранения мазута для котельной** | Сооружение неустановленного назначения | - | 610/С-54360 |
| Составные части и принадлежности: насосная (А), мазутохранилище (Б), емкости (В): емкость № 1 (в1), емкость № 2 (в2), ограждение (Г) | | | |

***Сведения о земельных участках:***
- пл. **0,6332** га предоставлен на праве аренды (срок действия по 03.06.2044) для обслуживания участка регенерированного волокна и пожарного депо. Ограничения (обременения) охранные зоны объектов газораспределительной системы (пл. 0,0010 га);
- пл. **0,3414** га предоставлен на праве аренды (срок действия по 06.04.2045) для обслуживания склада строительных материалов и сооружения для хранения мазута для котельной. Ограничения (обременения) прав: природные территории, подлежащие специальной охране (водоохранная зона реки, водоема – пл. 0,2818 га), охранные зоны объектов газораспределительной системы (пл. 0,0177 га)

**Условия аукциона:** покупатель обязан приобрести имущество, числящиеся на балансе продавца и расположенное на территории лота № 1. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 246 720,00 бел. руб.**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Лот № 2** | | | |
| **Склад готовой продукции** | Здание специализир. складов, торг. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ | 1374,7 | 610/С-29853 |
| **Швейный цех** | Здание швейного цеха | 2867,1 | 610/С-18495 |
| Составные части и принадлежности: две пристройки | | | |

***Сведения о земельных участках:***
- пл. **0,3537** га предоставлен на праве аренды (срок действия по 11.05.2045) для строительства и обслуживания склада готовой продукции. Ограничения (обременения) охранные зоны сетей и сооружений теплоснабжения (пл. 0,0099 га);
- пл. **0,2956** га предоставлен на праве аренды (срок действия по 11.05.2045) для строительства и обслуживания швейного цеха. Ограничения (обременения) прав: охранные зоны сетей и сооружений теплоснабжения (пл. 0,0083 га)

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 967 200,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

*Оплата предмета торгов должна быть произведена после заключения договора купли-продажи:*
*- по лоту № 1 –* в течение 24 месяцев с ежемесячной уплатой равными долями и с учетом процентов в размере однодневной ставки рефинансирования, установленной национальным банком РБ за каждый день рассрочки платежа, действующий на дату заключения договора купли-продажи;
*- по лоту № 2 –* если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета торгов, то в течение 30 календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущие извещения о проведении аукциона опубликованы в газете «Звязда» от 26.06.2020

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения торгов

| | |
|---|---|
| Дата и время начала и окончания электронных торгов | **Начало торгов 30.09.2020 в 12.00. Окончание торгов 30.09.2020 в 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| Дата и время окончания приема заявок | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 28.09.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

---

**15 сентября 2020 года в 14.00 в актовом зале общества состоится внеочередное общее собрание акционеров**

## ОАО «Вишневка – 2010»

**с повесткой дня:**

1. Внесение изменений в состав членов Наблюдательного совета ОАО «Вишневка – 2010».

Регистрация участников общего собрания акционеров будет осуществляться 15 сентября 2020 года с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания.

Для регистрации необходимо иметь при себе: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по месту нахождения общества (Минский район, аг. Вишневка, ул. Центральная, д. 1А) с 08.00 до 17.00 с 02 по 14 сентября 2020 года.

УНП 600041880

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 410/С-18515 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ 2 29 08, наименование – склад овощной), обшей площадью 605,1 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Жолудева, 86

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 420850100001011300, площадью 0,3607 га (назначение – земельный участок для обслуживания склада овощного), расположенном по адресу: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Жолудева, 86Г. Земельный участок имеет обременения (ограничения) прав в использовании: земли, расположенные в зонах санитарной охраны водных объектов, используемых для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зонах санитарной охраны в местах водозабора площадью 0,3607 га, код – 2.7; земли, расположенные в прибрежных зонах рек и водоемов, площадью 0,3456 га, код – 2.5; земли, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, площадью 0,0151 га, код – 2.4

Начальная цена продажи – 12 240 руб. (двенадцать тысяч двести сорок рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 1 224 руб. (одна тысяча двести двадцать четыре рубля)

**Продавец – Волковысский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231900, г. Волковыск, ул. Брестская, 32, тел. 8-01512-621-86**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 02 октября 2020 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 13.04.2020 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 30 сентября 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion/**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Планар» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже**

## ПРОДОВОЛЬСТВЕННОГО МАГАЗИНА

**общей площадью 290,6 кв. м, инв. № 601/С-28791, расположенного на земельном участке площадью 0,1241 га с кадастровым номером 623288005101000003 (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, Логойский район, Янушковичский с/с, д. Жабичи, ул. Полевая, 2.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **22 080,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **2 208,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **15.10.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.10.2020** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, 136-31-11.**

УНП 100104937

---

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор аукциона)**
**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего государственному предприятию «ЦЕНТРКУРОРТ» (Продавец)**

**Лот № 1:** легковой специальный вагон VOLKSWAGEN MULTIVAN, кузов (рама) № WV2ZZZ7HZ4H081357, г. в. – 2004. Местонахождение: г. Минск, ул. Карла Либкнехта, 54/35. Начальная цена с НДС – 20 928,00 руб. **Аукцион состоится 14.09.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.** Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по иуществу Республики Беларусь **gki.gov.by** и на сайте Организатора аукциона ino.by.

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

---

# ИЗВЕЩЕНИЕ

## о проведении 16 сентября 2020 года повторных торгов с условиями по продаже жилых помещений (квартир), принадлежащих ОАО «Минский домостроительный комбинат»

**Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)**

| № предмета торгов | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Начальная цена, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | «квартира 4» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-4 (1-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 62,9 кв. м, общая площадь по СНБ – 65,3 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805726) | 144 800,00 | 5 000,00 |
| 2 | «квартира 8» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-8 (2-й этаж, трехкомнатная, общая площадь – 72,2 кв. м, общая площадь по СНБ – 77,2 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805730) | 157 600,00 | 5 000,00 |
| 3 | «квартира 12» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-12 (3-й этаж, трехкомнатная, общая площадь – 72,1 кв. м, общая площадь по СНБ – 77,1 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805734) | 156 800,00 | 5 000,00 |
| 4 | «квартира 13» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-13 (4-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 60,0 кв. м, общая площадь по СНБ – 62,5 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805735) | 135 200,00 | 5 000,00 |
| 5 | «квартира 17» по адресу: г. Минск, ул. Серова, 54-17 (5-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 60,0 кв. м, общая площадь по СНБ – 62,5 кв. м, инвентарный номер 500/D-798805739) | 132 000,00 | 5 000,00 |
